ПРАЛЕТАРЫ УСЕХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 205 (3313) Нядзеля 8-га верасьня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ВАРШАВА, 7. Агэнты тайнай паліцыі сярод дня зрабілі налёт на рэдакцыю газ. „Самопомоц хлопска", прычым зрабілі спробу заарыштаваць прысутнага ў рэдакцыі дэпутата партыі сялянскай самапомачы—Вайковіча, Гэтаму перашкодзілі рабочыя, якія папраўлялі каналізацыю ў памяшканьні рэдакцыі. Вайковіч скрыўся

ЗАМЕЖНЫЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р

РАГАЧЭЎ (ніж кар.). Беднота Гарадзецкага сельсавету Рагачэўскага раёну у ліку 140 чал. арганізавала налгас. Гэта вельмі не спадабалася кулакоў, частка зямлі якіх павінна была перайсьці да калгасьнікаў.

Калі два беднякі в. Сяменаўка падалі заяву ў саўгас, заможнікі тай-жа вёскі пад кіраўніцтвам кулака ПРЫМАКА ноччу напалі на гэтых бедняко ў і моцна зьбілі іх. Па справе вядзецца тэрміновае расьсьледваньне. Кулакі арыштаваны.

Мацней ударым па правых апартуністых

Агонь па нацыянал-дэмакратызму, па шавінізму усіх масьцей

ЗА ВЫРАЗНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ЛІНІЮ Ў РАБОЦЕ УСІХ ОРГАНАЎ, УСІХ ЗЬВЕНЬНЯЎ

Зьняць з кіраўніцтва правых ухілістых, усіх няздольных на справе праводзіць з усей сілай гэнеральную лінію партыі. Замяніць іх моцнымі, загартаванымі бальшавікамі

МАСАВАЕ ВЫЛУЧЭНЬНЕ РАБОЧЫХ У ДЗЯРЖАПАРАТ—НАША БАЯВАЯ ЗАДАЧА

Самакрытыка ў Беларусі слабая. Мацней, ня гледзячы на асобы, разгорнем масавую самакрытыку!

Да пытаньняў барацьбы з правым ухілам у КП(б)Б

У сэрыі артыкулаў з Беларусі, падпісаных ініцыялямі А. І. і надрукаваных у жніўні г. г. у «Комсомольской Правде», закрануты амаль што ўсе важнейшыя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Нельга недаацэньваць значэньня гэтых артыкулаў у газэце, якая зьяўляецца цэнтральным органам ЛКСМ.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ «КОМСОМОЛЬСКОЙ ПРАВДЫ» АДЫГРАЛА СТАНОЎЧУЮ РОЛЮ. АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭНЬНІ АРТЫКУЛАЎ А. І. ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ПРАВІЛЬНЫМІ. Яно (выступленьне «К. П.») дапамагло партарганізацыі, а таксама і нашаму друку, шырэй мабілізаваць масы на барацьбу з праяўленьнямі апартунізму і нацыянал-дэмакратызму ў практыцы работы розных нашых арганізацый і ўстаноў. Працягваючы ініцыятыву нашай партарганізацыі і некаторых мясцовых газэт, асабліва «Зьвязды», якая больш году ўзмоцнена працуе ў гэтым напрамку, «К. П.» СВАІМІ ВЫСТУПЛЕНЬНЯМІ ДАПАМАГЛА ЎЗМАЦНЕНЬНЮ ТЭМПУ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ ПРАВА - ЎХІЛІСЦКІХ І НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СКАЖЭНЬНЯЎ ПАРТЫЙНАЙ ЛІНІІ Ў БЕЛАРУСІ.

Тым больш каштоўна выступленьне «К. П.», што БАРАЦЬБА З ГЭТЫМІ ЗЬЯВІШЧАМІ Ў НАС, У БЕЛАРУСІ, БЫЛА НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЙ.

У гэтым, зразумела, — вялікая заслуга газэты.

Аб права апартуністычнай лініі ў зямельнай палітыцы

Бязумоўна, адным з важнейшых пытаньняў, асьветленых «К. П.», зьяўляецца пытаньне аб зямельнай палітыцы ў БССР.

У Беларусі на працягу раду гадоў праводзілася права-апартуністычная палітыка у зямельным пытаньні: стаўка на умацаваньне кулацкае гаспадаркі, насаджэньне хутароў, невыстарчальная абрэзка зямлі ў кулацтва, пакіданьне яму больш высокіх норм зямлі, невыстарчальны ўлік інтарэсаў беднаты, палітыка затрыманьня калектывізацыі.

І У ПЕРЫЯД ПАСЬЛЯ 15 ЗЬЕЗДУ УсеКП(б)), на якім партыя з усёй сілай паставіла пытаньне аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі, аб усямерным узмацненьні сацыялістычнага сэктару ў вёсцы, аб рашучым узмацненьні наступленьня супроць кулацтва,—У ЗЯМЕЛЬНАЙ РАБОЦЕ БЕЛАРУСІ ГЭТА ГЭНЕРАЛЬНАЯ ЛІНІЯ НЕ ЗНАЙШЛА АДБІТКУ, не быў створаны пералом.

НКЗ НА СПРАВЕ ПРАЦЯГВАЎ СТАРУЮ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ ЛІНІЮ.

Гэта палітыка і практыка НКЗ спрыяла ўзмацненьню эканамічнай магутнасьці кулацтва і тым самым, урэшце, спрыяла ўзмацненьню росту палітычнай актыўнасьці кулака і яго ідэолёгаў. Гэта аграрная палітыка вынікала з права-апартуністычнай установкі на «багацеючага селяніна», на стварэньне капіталістычнага фэрмэра. ЯНА (зямельная палітыка) БЫЛА — ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ ТЭОРЫІ «УЗБАГАЧАЙЦЕСЯ» І «ПАШЫРАНАГА НЭПУ» НА ПРАКТЫЦЫ. Партыя разгарнула мабілізацыю пралетарскіх і бядняцка-серадняцкіх мас супроць кулацтва, узмацніла наступленьне супроць яго, памаючы на шляху перашкоды, што ставяць права - апартуністычныя элемэнты. Пасьпяховы ход індустрыялізацыі БССР, рост пралетарскіх кадраў і іх вывучкі ў штодзённай клясавай барацьбе, эканамічная дапамога беднаце і серадняцкаму сялянству, падатковая палёгка для сераднякоў і ільготы беднаце, пачатак работ па калектывізацыі, якая моцна і стыхійна зарэ разгортваецца,—усё гэта гаварыць АБ УЗМАЦНЕНЬНІ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ Ў БЕЛАРУСІ, АБ УЗМАЦНЕНЬНІ САЮЗУ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ З СЕРАДНЯКОМ І ЯГО КІРУЮЧАЙ РОЛІ Ў ГЭТЫМ САЮЗЕ, І ЎЗМАЦНЯЕ ЗНАЧЭНЬНЕ БЕДНАТЫ, ЯК АПОРЫ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ Ў ВЁСЦЫ.

Яшчэ да XII-га зьезду КП(б)Б на радзе парткамфэрэнцый (раённых і акруговых), а потым і на самым зьезьдзе, былі паказаньні на стан рэчаў у галіне зямельнай палітыкі.

«Зьвязда» і «Рабочий» у радзе артыкулаў і заметак (справа вышэйшай калегіі зямельнага кантролю і Лабаноўскага, аб фіктыўных культурных гаспадарках, аб няпразільнасьцях пры крэдытаваньні, аб агульным напрамку зямельнай палітыкі і г. д.) ня раз сыгналізавалі партарганізацыі аб дрэнным стане ў галіне правядзеньня зямельнай палітыкі.

У выкананьне дырэктыў XII-га зьезда КП(б)Б і XV зьезду УсеКП(б),—партыйная арганізацыя, перамагаючы супраціўленьне паасобных няўстойлівых элемэнтаў у частцы кіруючых кадраў, узялася за помку старое памылковае лініі. Быў узяты курс на калектывізацыю, на давядзеньне няскончанай аграрнай рэвалюцыі да канца, на больш рашучую абрэзку кулацтва, на забесьпячэньне беднаты зямлёю, на большае ўмацаваньне кіраўніцтва пралетарыяту сялянствам.

ЦК партыі ў сваёй пастанове ад 13-га МАЯ г. г. гаворыць: «Бюро ЦК лічыць востра пасьпеўшай, АСАБЛІВА на даным этапе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і наступленьня на капіталістычныя элемэнты, ЗАДАЧУ РАШУЧАЕ ЗЬМЕНЫ ІСНУЮЧЫХ ПА БССР НОРМ ЗЯМЛЯНАДЗЯЛЕНЬНЯ Ў БОК БОЛЬШАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ БЕДНАТЫ, СТЫМУЛЯВАНЬНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ БЯДНЯЦКІХ І СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК ЗА ЛІК УРЭЗКІ ЗЯМЕЛЬ У ЗАМОЖНЫХ ПЛАСТОЎ ВЁСКІ, з тым, каб пры гэтым ня былі закрануты серадняцкія гаспадаркі». У гэтай-жа сваёй пастанове бюро ЦК прапануе фракцыі СНК распрацаваць канчаткова пытаньне аб нормах зямлянадзяленьня з «прыцягненьнем да прапрацоўкі гэтага пытаньня аўтарытэтнай кансультацыі з камуністых - аграрнікаў Камуністычнай Акадэміі і прадставіць на Бюро ЦК з тым, каб увосень на сэсіі ЦВК перагледзець зямельны кодэкс». Пастановаю ад 7-га чэрвеня ЦК КП(б)Б забараніў хутарское і дробнапасялковае зямляўпарадкаваньне. Яшчэ раней, у сакавіку г. г., ЦК быў зьняты з работы наркамзем Прышчэпаў. А яшчэ раней, быў зьняты, а потым і выключаны з партыі за праваапартуністычныя скажэньні партыйнай лініі, за настойваньне на сваіх памылках у рабоце старшыня калегіі вышэйшага зямельнага кантролю Лабаноўскі.

ТРЭБА АДКРЫТА СКАЗАЦЬ, ШТО МЫ ЗНАЧНА СПАЗНІЛІСЯ З ПАСТАНОЎКАЮ ГЭТЫХ ПЫТАНЬНЯЎ. ГЭТЫЯ ПАСТАНОВЫ—ТОЛЬКІ ПЕРШЫЯ КРОКІ ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ ЛІНІІ Ў ЗЯМЕЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ. ГЭТЫМІ ПАСТАНОВАМІ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА МАБІЛІЗАЦЫЯ ПАРТЫІ І ШЫРОКІХ МАС ПРАЦОЎНЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАВІЛЬНУЮ ЛІНІЮ Ў ЗЯМЕЛЬНЫМ ПЫТАНЬНІ.

Але факт застаецца фактам: значна раней зьяўленьня артыкулаў у «К. П.» ЦК КП(б)Б паставіў гэтыя пытаньні і прыступіў да работы па стварэньні пералому ў зямельнай палітыцы і практыцы.

Таму, больш дзіўным зьяўляецца АПОШНІ артыкул у «К. П.», апублікаваны 3-га верасьня, пад такімі прэтэнцыёзнымі загалоўкамі: «Тайное стало явным», «Разоблачения «Комсомольской Правды» о кулацкой политике НКЗ БССР подтверждаются целиком».

Яшчэ-ж у пачатку чэрвеня ў «Правде» і «Зьвязьдзе» быў апублікаваны вялікі артыкул тав. Затонскага аб хутарызацыі, які ставіць усе кропкі над «і». Тады-ж праходзілі ў Менску раённыя партканфэрэнцыі, на якіх пытаньне аб зямельнай палітыцы, хутарызацыі, аб ідэолёгах і практыках гэтай палітыкі, Прышчэпаву, Лабаноўскім, было асьветлена і тады-ж быў апублікован вядомы абежнік НКЗ.

Але А. І. ідзе яшчэ далей. Ён піша: «Ня так даўно ў БССР быў запрошан ні то НА ПРАДМЕТ НАШАГА... «ПОСРАМЛЕНІЯ», ні то, як афіцыйна вядома, «для консультации по земельных справах», член прэзыдыуму аграрнага інстытуту Камакадэміі тав. Кубанін».

Мы бачылі, што ЎЖО 13-га МАЯ, г. зн. задоўга да зьяўленьня артыкулаў А. І. было вырашана пытаньне аб неабходнасьці зьмены існуючых норм зямлянадзяленьня і аб ЗАПРАШЭНЬНІ КАНСУЛЬТАНТА ПА ЗЯМЕЛЬНЫХ СПРАВАХ З КАМАКАДЭМІІ ДЛЯ ДАПАМОГІ Ў РАСПРАЦОЎЦЫ НОВЫХ НОРМ.

Факты, паданыя вышэй, паказваюць, што КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ БЕЛАРУСІ ЗНАЙШЛА Ў СЯБЕ ДАВОЛІ СІЛ ДЛЯ ТАГО, КАБ ПАЧАЦЬ БАРАЦЬБУ З КУЛАЦКАЙ ЗЯМЕЛЬНАЙ ПАЛІТЫКАЙ І ГРАМІЦЬ «ПРЫШЧЭПАЎШЫНУ» яшчэ да артыкулаў у «К. П.».

Карыстаючыся цытатамі з «Нашай Нівы» (паданымі 27-га ліпеня ў перадавой «Зьвязды»), А. І. даводзіць, нібы правая палітыка ў зямельным пытаньні вынікае з таго, што ў Савецкай Беларусі ажыцьцяўлялася аграрная праграма «Нашай Нівы». Мы-ж думаем, што, як гэта відаць з паданага вышэй, НЯПРАВІЛЬНАЯ ЗЯМЕЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА СКЛАДАНАЙ ЧАСТКАЙ УСТАНОЎКІ ПРАВАГА ЎХІЛУ ВА УсеКП(б) І МАЕ СВАЁЙ ПАДАСНОВАЙ ТЭОРЫЮ «РАСШИРЕННОГО НЭПА» І ЛЁЗУНГ «ОБОГАЩАЙТЕСЬ».

А. І. выводзіць зямельную палітыку з аграрнай праграмы «Н. Н.» толькі таму, што ЎСЕ ПРАЯЎЛЕНЬНІ ПРАВАГА ЎХІЛУ Ў БЕЛАРУСІ ЁН ЗВОДЗІЦЬ ДА АДНАГО ТОЛЬКІ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛ - ДЭМАКРАТЫЗМУ. Замест таго, каб паказаць, як зямельная палітыка і практыка, што вынікалі з права-апартуністычных установак на «пашыраны нэп» і «ўзбагачайцеся», СПРЫЯЛІ ўмацаваньню кулака, а адсюль — і росту нацыянал - дэмакратызму, А. І., перавёртваючы ўсё на галаву, выводзіць зямельную палітыку з праграмы «Н. Н.».

Зусім відавочна, што нацыянал-дэмакратызм цесна пераплятаецца з права-ўхілісцкімі ўстаноўкамі і што правы ўхіл у Беларусі часта афарбоўваецца ў нацыянал - дэмакратычныя колеры. Але пагоня А. І. за «самабытнымі» карэньнямі правага ўхілу ў зямельнай палітыцы Беларусі толькі адхіляе партыю ад сапраўднай падаплёкі гэтага ўхілу, ускладняючы гэтым перамогу над ім.

Барацьба з праяўленьнямі нацыянам дэмакратызму

У сваіх артыкулах А. І. вельмі падрабязна спыняецца на праяўленьнях беларускага нацыянал - дэмакратызму. Факты і значная частка вынікаў, якія ён падае, у асноўным ПРАВІЛЬНЫЯ*)

Аднак, у асьвятленьні часткі гэтых фактаў А. І. пераходзіць ад аднэй крайнасьці да другой. То ён паказвае, што ў кастрычніку 1917 г. беларускія нацыянал-дэмакраты «пробовали презрительно и гордо ПРОЙТИ МИМО (падкрэсьлена А. І.) пролетарской революции», то пераўтварае гэтых «шутов» (як ён іх называе) амаль не ў кіраўнікоў лёсу Савецкай Беларусі.

Панашаму-ж, нацыянал - дэмакратызм з самага заснаваньня савецкай улады ў Беларусі, у саюзе з польскай і нямецкай контр-рэвалюцыяй, вёў узброенае змаганьне супроць саветаў, а зусім не займаў нэйтральнай пазыцыі («праходзіў міма»), як гэта прабуюць давесьці і ў нас сёй-той (гл. напрыклад, артыкулы Жылуновіча, Мацюкевіча і інш. у «Полымі» і «Савецкай Беларусі», тое-ж —у падручніку Ігнатоўскага і інш.).

Што азначае цьверджаньне А. І. аб тым, што нацыянал - дэмакратызму ў Беларусі «удалося створить нейкае падабенства адзінага нацыянальнага фронту?» Як гэта прымірыць з другім сьцьверджаньнем А. І. (праўда, у артыкуле, надрукаваным праз 15 дзён), што «толькі дзякуючы правільнай палітыцы партыйнай арганізацыі і яе кіраўніка, ЦК КП(б)Б, Савецкая Беларусь дабілася буйных посьпехаў у гаспадарцы, у разгортваньні нацыянальнай культуры»?

З аднаго боку, палітыка партыі прывяла да адзінства нацыянальнага фронту, г. зн. да поўнай здачы пралетарскіх пазыцый, або, як пра гэта гаворыць сам аўтар, гэта палітыка «ў важнейшых сваіх разгалінаваньнях вызначалася не сацыяльным, ня клясавым, а нацыянальным мэтаімкненьнем», а з другога боку —генэральная лінія КП(б)Б, прынаецца А. І. правільнай. Паводле А. І., такім чынам, выходзіць, што лінія КП(б)Б ня была клясава - пралетарскай, але ўсё-ж такі правільнай! З гэтай супярэчнасьці нельга выбрацца. Гутарка тут ідзе не аб «некаторых недахопах кіраўніцтва», а аб асноўным: ці вяла КП(б)Б лінію на ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, ці дабілася яна гэтага, ці ў БССР быў адзіны нацыянальны фронт, супадпрадкаваньне клясавых задач нацыянальным, г. зн. па сутнасьці — разбраеньне пралетарскай дыктатуры з нутра. Або-або, нічога «сярэдняга» тут не падана.

Мы думаем, што гэта асноўная і буйнейшая супярэчнасьць А. І.

Ці ёсьць у нас на Беларусі ЭЛЕМЭНТЫ нацыянальнага адзінства? Так, ёсьць. Ліст у рэдакцыю «Савецкай Беларусі» ў 1927 годзе, падпісаны пяцьма камуністымі і двума беспартыйнымі (з якіх адзін былы прам'ер белагвардзейскага беларускага ўраду) і накіраваны супроць органу ЦК КП(б)Б, газэты «Зьвязда»; антыпартыйны, антысавецкі ліст 3-х пісьменьнікаў (з якіх адзін — беспартыйны), зьмешчаны ў тэй-жа «Савецкай Беларусі», і рад іншых фактаў сьведчаць аб тым, што паміж паасобнымі беларусамі, партыйцамі - ўхілістымі і буржуазнымі беспартыйнымі нацыянал - дэмакратамі сьцерліся ўсе межы.

АЛЕ-Ж ХІБА ТАКОЕ СТАНОВІШЧА І ВА ЎЗАЕМААДНОСІНАХ ПАМІЖ ШЫРОКІМІ ПРАЛЕТАРСКІМІ І НАПОЎПРАЛЕТАРСКІМІ МАСАМІ І БЕЛАРУСКАЙ БУРЖУАЗІЯЙ?

Абвастрэньне клясавай барацьбы, узмацненьне сацыялістычнага наступленьня, больш частыя вылазкі нацыянал-дэмакратызму супроць Савецкае ўлады і Камуністычнае партыі якраз гавораць аб адваротным.

Некаторыя члены нашай партыі з тых, якія разьвіваюць тэорыю аб неабходнасьці непарыўных уступак буржуазнай інтэлігенцыі, прабавалі «давесьці» (№ 10 «Полымя» за 1928 г.), што ДА рэвалюцыі ў Беларусі было адзінства нацыянальнага руху. Мы ня разумеем: навошта А. І. зараз бярэцца закончыць гэтую схэму, сьцьвярджаючы, што і ПАСЬЛЯ перамогі рэвалюцыі ў БССР створана адзінства нацыянальнага фронту?*).

Нацыянал - дэмакратызм зьяўляецца палітычнай ідэалёгіяй буржуазнай рэстаўрацыі.

Сацыяльным базісам нацыянал-дэмакратызма зьяўляюцца капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі

У сувязі з ростам нашага сацыялістычнага наступленьня, абвастрэньнем клясавае барацьбы, АДБЫВАЕЦЦА ДАЛЕЙШАЯ ДЫФЭРЭНЦЫЯЦЫЯ Ў АСЯРОДКУ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ, УЗМАЦНЯЮЦЦА КАДРЫ, ЯКІЯ ГРУПУЮЦЦА ВАКОЛ ПАРТЫІ І САВЕЦКАЙ УЛАДЫ, РАЗАМ З ГЭТЫМ РАСЬЦЕ НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМ І ШАВІНІЗМ, ЯК ПРЫЛАДА ТЫХ ГРУП, ЯКІЯ ЎЗМАЦНЯЮЦЬ СВАЮ БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ НАШАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ.

Рост нашага сацыялістычнага наступленьня, далейшае ўзмацненьне пралетарскай дыктатуры выбівае ў гэтых груп і іх ідэолёгаў — буржуазнай інтэлігенцыі — надзею на магчымасьць нашага «мірнага спуску на тармазох». Наша наступленьне супроць гэтых сацыяльных праслоек выклікае іх контр-наступленьне, узмацненьне палітычных выступленьняў.

Працэсы, якія адбываюцца ў Заходняй Беларусі, дзе беларускі кулак і буржуазная інтэлігенцыя зьяўляецца складанай частнай фашысцкага лягеру, дзе беларускі нацыянал - фашызм зьяўляецца зброяй польскіх акупантаў на Заходняй Беларусі і прыладай у падрыхтоўцы вайны супроць СССР, — робіць таксама ўплыў на разьвіцьцё нацыянал-дэмакратызму ў нас. Нацыянал-дэмакратызм у БССР набывае ясна выяўлены заходніцкі характар, аб'ектыўна становіцца зброяй ваеннай палітыкі Пілсудскага.

Нацыянал - дэмакратызм зьбірае зараз свае сілы ў адно, антывізуецца, перамагае ідэёвы разброд у сваіх радох. Усе гэтыя элемэнты ўзмацняюць свае выступленьні супроць пралетарскае дыктатуры за «адрыў ад Масквы».

А як-жа А. І. тлумачыць узмацненьне палітычнай актыўнасьці нацыянал-дэмакратызму? Ён кажа: «Невыстарчальны адпор нацыянал - дэмакратызму дазволіў яму перайсьці ад абароны да наступленьня». Вось сапраўды глыбока - памылковае тлумачэньне працэсаў, што адбываюцца ў нашай шматнацыянальнай рэспубліцы.

Замест таго, каб зьвязаць наступальны характар нацыянал - дэмакратызму з контр - наступальнымі выступленьнямі кулацтва, замест таго, каб паказаць, як абвастрэньне клясавай барацьбы выклікае ўзмацненьнем нашага наступленьня на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, А. І. выводзіць пераход нацыянал - дэмакратызму да наступленьня з «невыстарчальнага адпору» мясцовай арганізацыі.

НАСТУПАЛЬНЫ, ВАЯЎНІЧЫ ХАРАКТАР НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМУ ТЛУМАЧЫЦЦА ВЯЛІКІМІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМІ ЗРУХАМІ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА Ў НАШАЙ КРАІНЕ І ЗА ЯЕ МЕЖАМ, АЛЕ-Ж ЗУСІМ ВІДАВОЧНА, ШТО «РАБОТА» НЕКАТОРЫХ НАШЫХ ОРГАНАЎ МОЖА СПРЫЯЦЬ І САПРАЎДЫ СПРЫЯЛА РОСТУ ГЭТАГА НАЦЫЯНАЛІЗМУ.

І толькі правільна ўяўляючы прычыны актывізацыі нацыянал-дэмакратызму ў сучасны пэрыяд, можна з посьпехам перамагаць «дзейнасьць» тых нашых органаў, якія працавалі яму на-руку, і ўзмацніць наступленьне з боку нашых партарганізацый супроць нацыянал - дэмакратызму.

А. І. у даным выпадку ня бачыць сапраўдных прычын гэтай актывізацыі, таму, што прымітыўна ўяўляе сабе разьвіцьцё нацыянал - дэмакратызму і адгэтуль прыходзіць да выводу, што з нацыянал - дэмакратызмам можна пакончыць адным ударам. Вывад, гэты далёка не дапаможа партыі ў яе сапраўднай барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам.

Вось той шлях разьвіцьця нацыянал-дэмакратаў, які малюе А. І.: з пачатку яны «горда прайшлі міма пралетарскай рэвалюцыі», потым «пайшлі на службу да буржуазіі». І вось, «дайшоўшы да апошняй ступені палітычнага ўпаду, яны ўсё-ж аказаліся выкінутымі на вуліцу. У іх паслугах на сваёй тэрыторыі капіталістычная Эўропа больш ня мела патрэбы. Яны маглі ёй быць патрэбны толькі... у Савецкай Беларусі. І вось пачынаецца «исход». Па ўсіх дарогах у Беларускую Савецкую Рэспубліку пацягнуліся жывыя нябожчыкі».

Пытаньне, аднак, больш сур'ёзнае і больш глыбокае, як гэта ўяўляе А. І. Мы лічым, што гэты «исход», пра які гаворыць А. І., быў выкліканы працэсам палітычнага разлажэньня эміграцкай інтэлігенцыі, вялікімі палітычнымі зрухамі, якія адбыліся ва ўмовах узмацненьня дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі. НЯ НАША БЯСЬСІЛЬЛЕ, А НАША МАГУТНАСЬЦЬ ВЫКЛІКАЛА ГЭТЫ «ИСХОД».

Ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы ў краіне, сярод гэтых груп адбываюцца значныя перасоўкі. Частка з іх становіцца на чале кулака і нэпмана, якія супраціўляюцца і наступаюць, частка ня спыняе сумленнай працы ў БССР. Задача заключаецца ў тым, каб узмоніць агонь па варожых нам групах.

Як А. І. падыходзіць да пытаньня аб нацыянал - дэмакратызьме і барацьбе з ім, паказвае, між іншым, самы канец яго апошняга артыкулу. Ён піша: «з нацыянал - дэмакратызмам, НЕ ЗВАЖАЮЧЫ НА АСОБЫ (падкрэсьлена А. І.) ТРЭБА РАШУЧА ПАКОНЧЫЦЬ!» Калі-б А. І. разумеў найглыбейшую сувязь нацыянал - дэмакратызму з карэньнямі капіталізму, якая існуе ў нашай краіне, ён не сказаў-бы гэтага.

Патрэбна ШТОДЗЕННАЯ, няўхільная мабілізацыя мас на барацьбу з небясьпекаю нацыянал - дэмакратызму. Гэта небясьпека, дзякуючы суседзтву з фашысцкай Польшчай у нас, у БССР, асабліва рэальна. І той, хто думае, што адным ударам можна адразу ПАКОНЧЫЦЬ з нацыянал-дэмакратызмам, той па-сутнасьці не даацэньвае гэтае небясьпекі, садзейнічае ўсыпленьню штодзённай пільнасьці мас.

Калі А. І., ня бачачы сувязі паміж актывізацыяй нацыянал - дэмакратызму і ўзмацненьнем барацьбы кулацтва супроць нас і таму не разумее необходнасьці сыстэматычнай і ўпартай барацьбы з нацыянал - дэмакратызмам (можна «пакончыць»), дык, з другога боку, ня бачачы абвастрэньня клясавай барацьбы (у БССР — «падабенства адзінага нацыянальнага фронту»), ён ня бачыць і сіл, якія з нацыянал-дэмакратызмам змагаюцца і, ПРЫ ПРАВІЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ, будуць усё больш і больш яго перамагаць.

Таму — вось А. І. і ставіць у адны дужкі і ярых нацыянал - дэмакратаў і барацьбітоў з імі. Такое зьмешаньне ня можа дапамагаць узмацненьню барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам.

Абураючым, глыбока памылковым зьяўляецца залічэньне «Зьвязды» ў разрад «новазьяўленых прыяцеляў Савецкай Беларусі», што падрыхтоўваюць контр - рэвалюцыю внутры.

«Зьвязда» на ўсім гэтым этапе выступала супроць нацыянал-дэмакратычных скажэньняў у нацыянальна - культурным будаўніцтве, расшыфроўваючы тэорыю «самабытнасьці», рашуча змагалася супроць заходніцтва, супроць ідэалізацыі дробна - буржуазных партый у Беларусі і фальсіфікацыі гісторыі КП(б)Б, супроць стаўкі на нацыянал-буржуазную інтэлігенцыю. «Зьвязда» ўзьняла пытаньне за необходнасьць паставіць асноваю асноў задачу падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў на Беларусі.

«Зьвязда» мае і «баявыя рубцы», атрыманыя ў гэтых сутычках з нацыянал-дэмакратызмам. Супроць «Зьвязды» вялося і вядзецца сыстэматычнае цкаваньне з боку нацыянал-дэмакратаў БССР і белагвардзейскага друку ў Зах. Беларусі.

Праўда, «Зьвязда» ЗРАБІЛА БУЙНУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ПАМЫЛКУ, ЗЬМЯСЬЦІЎШЫ РЭЦЭНЗІЮ ЛЁСІКА АБ КНІЗЕ ТАРАШКЕВІЧА. Але гэта памылка зусім не апраўдвае тэй кваліфікацыі, якая даецца А. І. «Зьвязьдзе».

Мы ўжо гаварылі вышэй, што пераход нацыянал-дэмакратызму ў наступленьне зьвязан з клясавымі зрухамі ў краіне. Мы таксама зазначылі, што «работа» некаторых нашых органаў дапамагала росту нацыянал-дэмакратызму.

Узяць хоць-бы Наркамасьветы. НКА БАЛІЦКІ, замаест таго, каб паставіць рашуча і цьвёрда падрыхтоўку беларускіх пралетарскіх кадраў, замест таго, каб узяць рашучы курс на вылучэньне сьвежых сіл, па сутнасьці рабіў стаўку на нацыянал - буржуазную інтэлігенцыю. У пагоні за «карыфеямі» нацыянальна-культурнага руху, ён прагледзеў падрастаючыя пралетарскія кадры, ігнараваў іх.

Загульваньне з нацыянал-буржуазнымі элемэнтамі, якое мела месца з боку правых і прымірэнцкае часткі кіруючых партыйных і савецкіх працаўнікоў, прыводзіла на справе на некаторых вучастках работы да адмаўленьня гэтых асоб ад ідэалёгічнай барацьбы з нацыянальна - буржуазнымі элемэнтамі і да здачы з боку гэтых асоб пралетарскіх пазыцый.

Чым вытлумачыць поўную адсутнасьць марксыцкіх работ па эканоміцы, гісторыі, геаграфіі Беларусі?

Чым вытлумачыць спробу ўзьвесьці ў гэрої ордэну працоўнага сьцягу такога махровага рэакцыянэра, як ЭПІМАХ-ШЫПІЛА (пастанова калегіі НКА аб гэтым ёсьць)?

Чым вытлумачыць палёнізатарскую работу, якая праводзіцца Лёсікам і К-о ў галіне беларускага мовазнаўства?

Чым вытлумачыць манапольнае панаваньне буржуазных спэцаў тыпу ГАРЭЦКАГА і КІСЬЛЯКОВА ў дасьледчым інстытуце сельскае гаспадаркі?

Інакш, чым можна тлумачыць, што «ПОЛЫМЯ» і «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» часта зьяўляліся рупарамі нацыянал-дэмакратызму.

ТОЛЬКІ ДЗЯКУЮЧЫ НАЯЎНАСЬЦІ ПРАВЫХ ЭЛЕМЭНТАЎ І ПРЫМІРЭНЦАЎ У ЧАСТЦЫ КІРУЮЧЫХ КАДРАЎ І Ў САМОЙ АРГАНІЗАЦЫІ МЫ МАЕМ ТАКІЯ ЗНАЧНЫЯ ПРАРЫВЫ НА ПАСАОБНЫХ ВУЧАСТКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

А. І. на працягу шасьці сваіх артыкулаў у «Комсомольской Правде» НІВОДНАГА СЛОВА не сказаў пра расійскі, яўрэйскі, польскі шавінізмы.

Партыя і яе орган «Зьвязда» заўсёды вялі барацьбу супроць УСІХ ВІДАЎ ШАВІНІЗМУ. «Зьвязда», у памянёнай ужо перадавой, так кваліфікуе небясьпеку кожнага з гэтых нацыяналізмаў.

«Абвастрэньне клясавай барацьбы ўнутры краіны і ліханкавая работа міжнароднага, у першую чаргу польскага, імпэрыялізму, па падрыхтоўцы ваеннага нападу на Савецкі Саюз, прымушаюць нас на даным гістарычным этапе ўсямерна ўзмацніць барацьбу з усімі шавінізмамі, як зброяй контр-наступленьня на нас клясавага ворага і сканцэнтраваць галоўны агонь на найбольш актыўным, найбольш небясьпечным у даны момант нацыяналізьме.

Вялікадзяржаўны расійскі шавінізм у БССР, які доўгі час панаваў, адкрыта і актыўна выступаў супроць нацыянальнай палітыкі КП(б)Б, дзякуючы энэргічным нашым мерапрыемствам зараз прытаіўся, рэдка выступае адкрыта, дзейнічае цішком. Удары расійскім нацыянал-дэмакратам і зьменавехаўцам, што наносяцца ў РСФСР, адчувальны і для расійскіх шавіністых на тэрыторыі БССР. Але, паколькі асноўная база для разьвіцьця вялікадзяржаўнага расійскага нацыяналізму ва ўмовах РСФСР застаецца ўсё яшчэ вялікай, паколькі з абвастрэньнем клясавай барацьбы вялікадзяржаўны расійскі нацыяналізм актывізуецца і, у сваю чаргу, узмоцнена харчуе вялікадзяржаўныя імкненьні расійскіх шавінізмаў у нацыянальных рэспубліках, пастолькі нам, у БССР, ня толькі ня прыходзіцца ў якой-небудзь ступені паслабляць нашу ўвагу да барацьбы з гэтым шавінізмам, але трэба гэтую барацьбу ўсяк узмацняць, выцягваць гэты нацыяналізм з усіх прытульных куткоў, дзе ён зараз прытаіўся, выкрываць яго праяўленьні, як-бы яны старанна ня былі замаскаваны.

Яўрэйскі нацыяналізм, зьяўляючыся ідэалёгіяй гарадзкіх і местачковых нэпманаў, а таксама нацыяналістычнай часткі яўрэйскай інтэлігенцыі, сплятаючыся з ваяўнічым клерыкалізмам, прадстаўляе ў даны момант ва ўмовах БССР, у зьвязку з узмацненьнем сацыялістычнага наступленьня, больш актуальную небясьпеку, чым раней. Абвастрэньне клясавай барацьбы адбілася на актывізацыі яўрэйскага нацыяналізму. Ідэалёгія яўрэйскага «адзінства нацыянальнага фронту» прывяла ўжо да прарыву на паасобных вучастках нашай работы (кулацкая палітыка сампрамка-апэрацыі, засьмечаньне некаторых яўрэйскіх калектываў клясава-чужым элемэнтам).

Польскі шавінізм у сучасных умовах таксама актывізуецца. Вельмі часта гэта яго актывізацыя зьяўляецца вынікам ня толькі агульных сацыяльных прычын, але і падмацоўваецца непасрэднай работай агентуры польскай дэфэнзывы. Невыстарчальная клясавая дыфэрэнцыяцыя і некаторая нацыянальная замкнутасьць і абасобленасьць польскага насельніцтва ў БССР паказвае, што націск ідэалёгіі польскага «адзінага нацыянальнага фронту» даволі моц

Прыезд у Менск дэлегацыі рабочых і сялян Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны

Да 7 гадзін увечары пэрон Менскага вакзалу і пляц перад станцыяй былі перапоўнены тысячным натоўпам. З усіх прадпрыемстваў і ад саюзаў зьявілася дэлегацыі са сьцягамі, плякатамі і аркестрамі сустракаць дарагіх гасьцей. Зьяўленьне польскай дэлегацыі на сходках вагону выклікала магутныя крыкі «ура», «няхай жыве рабочая кляса Польшчы». Адзін за адным праз вузкую сьцежку паміж двух людзкіх сьцен прабраліся дэлегаты да выхаду.

На пляцы перад станцыяй госьцям была наладжана бурная авацыя. Дэлегатаў закідалі кветкамі, крыкі «ура» зьліліся з громам шматлікіх аркестраў. На імправізаванай трыбуне—грузавіку—быў арганізаваны ляпучы мітынг.

Вітаўшы дэлегацыю ад імя рабочых г. Менску т. АВЕРЫН прасіў дэлегатаў пазнаёміцца з сацыялістычным будаўніцтвам Савецкай Беларусі і паведаміць працоўным Польшчы і Заходняй Беларусі, як рабочая кляса і працоўнае сялянства БССР будуюць новае жыцьцё. Рабочы Эльводу т. МІКУШ на польскай мове запрасіў дэлегатаў пабываць на электрастанцыі і на іншых прадпрыемствах гораду, каб азнаёміцца з бытам і працай рабочых г. Менску.

З гарачай прамовай выступіў сакратар дэлегацыі т. БЭМ.

Ён вітаў працоўных г. Менску ад імя рабочых Польшчы, Зах. Беларусі і Украіны, а таксама ад 6 тысяч палітзьняволеных фашысцкіх турмаў.

Там, у Польшчы, аршытаваны найлепшыя нашы браты і барацьбіты за дыктатуру пралетарыяту; яны не маглі вас вітаць, але яны наказалі нам, былым вязьням, перадаць вам іх шчырае братэрскае прывітаньне. Мы прыехалі да вас завязаць з працоўнымі СССР больш шчыльны саюз, каб даць адпор імпэрыялістам, якія рыхтуюць вайну, адпор фашысцкаму ураду, які закрыў дзьверы для дэлегатаў працоўных палякаў СССР. Нас паслалі да вас, каб уласнымі вачыма пераканацца, як вы будуеце сацыялізм. ЗА 4 ТЫДНІ МЫ ЎБАЧЫЛІ Ў 100 РАЗ БОЛЬШ, ЧЫМ ДУМАЛІ ЗНАЙСЬЦІ. Мы, зразумела, ня верылі байкам буржуазных газэт, але мы не СПАДЗЯВАЛІСЯ ЎБАЧЫЦЬ ТАКОЙ ШЫРОКАЙ ТВОРЧАСЬЦІ МАС, ТАКОГА ВЯЛІЗНАГА РАЗМАХУ БУДАЎНІЦТВА ФАБРЫК, ЗАВОДАЎ, САЎГАСАЎ І КАЛГАСАЎ.

— МЫ З ВЯЛІКАЙ РАДАСЬЦЮ ГЛЯДЗІМО НА ВАШЫ ПОСЬПЕХІ, МЫ ТУТ У ВАС НЯ ЧУЖЫЯ, МЫ АДЧУВАЕМ СЯБЕ, ЯК У САПРАЎДНАЙ СВАЁЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ. Мы пераканаліся, што гэтыя посьпехі магчымы таму, што ў вас улада знаходзіцца ў руках рабочай клясы.

— Капіталістыя рыхтуюцца да вайны. Вашы газэты яшчэ недастаткова высьвятляюць гэтую падрыхтоўку. Дзяцей у школах атручваюць ненавісьцю да СССР і сацыялізму наогул. 50 проц. польскага бюджэту ідзе на ўзбраеньне. У Польшчы крызіс: большая частка заводаў не працуе, або працуе ня з поўнай нагрузкай, але ўвесь год, нават на 3 зьмены працуюць ваенныя заводы. Мы абяцаем, калі пачнецца вайна, абярнуць штыкі супроць уласнай буржуазіі, ператварыць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую. Няхай жыве БССР! Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Селянін КАВАЛЬЧЫК вітае рабочых Менску ад працоўных сялянства Заходняй Беларусі, якое знаходзіцца пад уціскам фашызму. Яго паслала сялянства, каб пабачыць жыцьцё працоўных мас у Савецкім Саюзе.

— Мяжа,—кажа т. Кавальчык,—падзяліла Беларусь на 2 часткі: краіну сацыялізму, дзе будуецца беларуская пралетарская культура, дзе разьвіваецца новае сьветлае жыцьцё, і прыгнечаную Заходнюю Беларусь. Нашы ўражаньні ад вашага будаўніцтва — самыя найлепшыя.

***

Пасьля мітынгу дэлегаты накіраваліся ў гасьцініцу, а адтуль на мітынг у Дом Культуры. У Менск прыехалі 22 дэлегаты, сярод іх 3 жанчыны.

Б—ў..

Як сустракалі дэлегацыю на Асінбудзе

У рабочым клюбе Асінбуду рабочыя электрастанцыі ўрачыста сустракалі прыехаўшую польскую дэлегацыю. Ад імя рабочых Асінбуду дэлегацыю вітаў тав. Цінціянаў.

З вялікай прамовай выступіў інжынэр Балабанаў. Ён адзначыў, што электрастанцыя будуецца на месцы, дзе раней была непраходная багна. Праз кароткі час агні Асінбуду асьвецяць рад округ БССР. Станцыя дасьць ток сотням заводаў і фабрык, электрафікуе Асінбуду прасякне ў 15 тысяч сельскіх гаспадарак, 150 калгасаў і саўгасаў. Асінбуд зробіць пераварот ў сельскай гаспадарцы, дасьць вялізны штурмок яе рэканструкцыі.

Выступалі яшчэ рад рабочых, якія прасілі дэлегацыю перадаць рабочым і працоўнаму сялянству Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны, што рабочыя Савецкай Беларусі не дапусцяць, каб імпэрыялістыя сарвалі сацыялістычнае будаўніцтва. З зброяй у руках яны адстаяць свае заваёвы.

— Перадайце наша гарачае прывітаньне працоўным Польшчы і нашым братом, што пакутуюць у фашысцкіх турмах.

Ад імя дэлегацыі адказвае беспартыйны рабочы—тэкстыльшчык т. Отто Мац.

— Я вельмі шчасьлівы бачыць вялікі размах сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе. За 4 тыдні, што мы знаходзімся ў вашай краіне, мы праехалі амаль увесь Саюз і пераканаліся ў вялізнейшых дасягненьнях рабочае клясы. Я добра памятую, як жылі рабочыя ў царскай Расіі.

Дазвольце Вас падзякаваць ад імя Лодзінскіх тэкстыльшчыкаў за братэрскую дапамогу, якую аказал. нам рабочыя Савецкай Беларусі ў вялікія дні 2-х месячнай забастоўкі. Няхай жыве СССР — бацькаўшчына ўсіх працоўных.

Прадстаўнік працоўнага сялянства Заходняй Беларусі т. Саша ў сваёй прамове ахарактарызаваў цяжкае жыцьцё сялян-беларусаў пад ботам польскіх фашыстых.

Дэлегатка польскіх сялянак т. Абаркуўна адзначыла, што яна бачыла грандыёзнае будаўніцтва пралетарскай дзяржавы. Зараз яна хоча пазнаёміцца з жыцьцём працоўнага сялянства Савецкай Беларусі.

***

Зранку 7/IX дэлегацыя, па просьбе рабочых і інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў Асінбуду, падрабязна знаёмілася з ходам будаўніцтва.

Магутны тэмп пабудовы зрабіў на дэлегатаў вялікае ўражаньне. На разьвітаньне сакратар дэлегацыі т. Бэм заявіў, што ўсё тое, што яны бачылі, не пакідае ніякага сумненьня, што вялікі пяцігадовы плян будзе выкананы.

ЦУДЗІН.

Рабочыя Капцэвіцкага с.-г. заводу запрашаюць да сябе дэлегацыю

Нарада бюро ячэек Мопр'у з удзелам прадстаўнікоў прафсаюзнай арганізацыі ад імя 813 рабочых—членаў саюзу Капцэвіцкага с.-г. заводу «Зьвязда» шле шчырае пралетарскае прывітаньне прыбыўшым ад варштату і плугу братом — прадстаўніком прыгнечаных працоўных мас Польшчы і просіць дэлегатаў не адмовіць рабочай масе заводу «Зьвязда»—прыехаць у госьці на ст. Капцэвічы, Мазырскае акругі.

Рабочыя з нецярпеньнем чакаюць сустрэчы з дарагімі гасьцямі.

Крывавыя баі ў Палестыне

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 3. Паводле апошніх вестак з Палестыны, рух, які прыняў спачатку буйныя разьмеры толькі ў гарадох, перакінуўся зараз у сельскія мясцовасьці. Арабамі разгромлены многія яўрэйскія калёніі. Арабы пераходзяць ад барацьбы з яўрэйскімі калёніямі да выступленьняў супроць ангельскіх улад. Ангельскія войскі і паліцыя, якія прабуюць давесьці сваю бесстароннасьць, адначасова з зброямі стрэляюць працягваюць разбройваць яўрэйскіх калёністых. З Ерусаліма паведамляюць, што ў мясцовасьці Амара нясе вартавую службу эскадрыльля ангельскіх самалётаў. Ангельская паведамляе эскадрыльля ўжыла ў раёне на ўсход ад Ерусаліма мэтады газавай атакі, скінуўшы з самалётаў вялізную колькасьць газавых бомб.

***

БЭРЛІН, 6. Паводле атрыманых вестак з Палестыны, сутычкі паміж арабамі і яўрэямі ня спыняюцца. У Яфэ новы ангельскі дэсант высадзіўся ў разгар арабскага нападу ня толькі на яўрэйскіх дамы і прадпрыемствы, але і на ўрадавыя ўстановы. У выніку ангельскага «замірэньня» забіта 46 арабаў. У Наблусе арабы прагналі ангельскую паліцыю і паднялі сьцяг незалежнай Арабіі над будынкам паліцэйскай управы. У горадзе Аленбі ангельцы павінны былі зьвярнуцца да артылерыі, каб перашкодзіць масавану прыцёку бэдуінаў з Трансіярданіі ў Палестыну. У зьвязку з нападам арабаў на яўрэйскую калёнію КААР Габар у Галілеі сутычкі паміж арабскімі паўстанцамі і ангельскімі акупацыйнымі войскамі працягваліся некалькі дзён. Над усёй Палестынай патруліюць ангельскія самалёты. У галоўнейшых пунктах краіны ўведзены ваенна-палявыя суды. Чакаюцца першыя сьмяротныя прыгаворы. Выказваецца небясьпека, што ваенна-палявая юстыцыя пушчана будзе ангельцамі ў першую чаргу ня супроць непасрэдных удзельнікаў крывавых сутычак, а супроць камуністых, што агітавалі за спыненьне міжусобнай барацьбы арабаў і яўрэяў і за супольную барацьбу з ангельскімі акупантамі. (ТАСС).

АДЫХОДЗЯЦЬ АД АПАЗЫЦЫІ

МАСКВА, 7. У ЦКК УсеКП(б) паступіла заява аб адыходзе ад апазыцыі Вуйовіча, Зорына, Данскога, Мясава, Асінскай, Баджанскай, Жжова, якія асуджаюць сваю фракцыйную барацьбу супроць партыі, прызнаюць генэральную лінію партыі і Камінтэрну правільнай, зьнімаюць свае подпісы з фракцыйных дакумантаў, прызнаюць усе партыйныя пастановы для сябе абавязковымі. Вуйовіч, Зорын, Данскі асуджаюць палітычную лінію Троцкага і яго аднадумцаў, як заснаваную на фальшывай ацэнцы клясавай прыроды партыкіраўніцтва. Яны лічаць шкодным арганізацыйную тактычную ўстаноўку групы Троцкага. Памылкі, дапушчаныя ў часе фракцыйнай барацьбы супроць партыі, яны лічаць шкодным для партыі і што яны могуць прынесьці карысьць толькі нашым клясавым ворагам. (ТАСС).

ЗЬВЕРСТВЫ КІТАЙСКАЙ ВАЕНШЧЫНЫ

ЗНОЎ АРЫШТЫ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН

ТОКІЁ, 7. З Харбіну паведамляюць, што мясцовыя ўлады працягваюць масавыя арышты і звальненьні савецкіх грамадзян, а таксама захоп асобных прадпрыемстваў К.-Уск. ч. (ТАСС).

ТОКІЁ, 7. З Харбіну падаюць: «З ліку зьняволеных у Сунгарскім канцэнтрацыйным лягеры 19 хворых жанчын. У паасобных мясцох савецкіх грамадзян караюць сьмерцю. Усяго знойдзена 12 трупаў з адсечанымі галавамі. (ТАСС).

У МАНЧЖУРЫІ ПАЎСТАЎ КІТАЙСКІ ПОЛК

ЧЫТА, 6. Як падаюць прыбыўшыя з 86-га раз'езду, ночу 30-га жніўня ў Манчжурыі паўстаў кітайскі полк, які адмовіўся ісьці ў акопы, што на граніцы. Для ўсьмірэньня быў выкліканы другі полк. Перастрэлка і крыкі даносіліся ўсю ноч да нашых вартавых застаў. (ТАСС).

Дзеньнік пленуму ЦК КП(б)Б

Учора на ранішнім пасяджэньні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Рачыцкага.

Выказваліся ў спрэчках т. т. Вайтэнкаў, Масюкоў, Хрысанфаў, Скараходаў, і Сьмірноў. Такім чынам па дакладу тав. Рачыцкага ў спрэчках выступала 18 таварышоў.

На гэтым-жа ранішнім пасяджэньні пленум заслухаў заключнае слова тав. Рачыцкага, пасьля якога з дакладамі аб папярэдніх выніках чысткі партыі, росьце і рэгуляваньні складу партыі выступілі т. т. Калнін і Гантман.

Усё вячэрняе пасяджэньне было прысьвечана абгаварэньню дакладу т.т. Калніна і Гантмана. Па дакладах выступалі т. т. Херсонскі, Шаліма, Нэйбэрг, Аранштам, Райнгольд, Агурскі, Крохмаль, Бужынскі, Сьвірыдаў і Васільпева. У канцы пасяджэньня пленум заслухаў заключныя прамовы дакладчыкаў.

Сход партактыву

Фрунзаўскага раёну

абудзецца ў панядзелак, а 6-й гадзіне вечара ў клюбе Карла Маркса.

Даклад: аб канкрэтных правах правага ўхілу

Білеты на ўваход—па ячэйках КП(б)Б.

СЬМЯЛЕЙ і ХУТЧЭЙ РАЗГАРНУЦЬ САМАКРЫТЫКУ МАС!

На сходзе партактыву Кастрычнікавага раёну

2-га верасьня ў клюбе імя К. Маркса адбыўся сход партактыву Кастрычнікавага раёну. У парадку дня было адно пытаньне: аб падрыхтоўцы савецкіх, вузаўскіх і вытворчых ячэек да чысткі партыі і чысткі савецкага апарату.

Даклад па гэтым пытаньні зрабіў т. Когана, які спыніўся на ходзе чысткі савецкага апарату і вялікіх недахопах у гэтым кірунку, якія ў асноўным тлумачацца невыстарчальнай увагай з боку прафэсыянальных, а таксама партыйных органаў, у напрамку рашучага прыцягненьня мас да гэтай справы.

Выступіўшы пасьля дакладчыка тав. Назараў, член ЦКК УсеКП(б), які прыехаў у Менск для азнаямленьня з ходам чысткі савецкага апарату і чысткі партыі, вельмі яскрава падкрэсьліў вялікія хібы ў гэтай рабоце. Ён адзначыў, што нельга адлязяць чыстку партыі ад чысткі савецкага апарату. Гэты разрыў трэба абавязкова зьнішчыць. Тав. Назараў лічыць, што як прафэсыянальныя, так і партыйныя органы, асабліва савецкія ячэйкі, ня ўжылі ўсіх мер у галіне сапраўднага разгортваньня чысткі савецкага апарату і абнаўленьня яго новымі сіламі—вылучэнцамі.

Савецкія ячэйкі дагэтуль яшчэ трымаюцца «змовы маўчаньня», бо нічым іншым нельга тлумачыць, што, напрыклад, у Менску такі доўгі час маглі існаваць гэткія агідныя зьявы і выкрыўленьні клясавае лініі, як у НК Зямляробства. Дзе-ж была парт'ячэйка НКЗ, якая бязумоўна аб гэтым ведала? Яна маўчала. Такая-ж зьява наглядаецца ў радзе іншых савецкіх ячэек, якія не вядуць рашучай барацьбы з недахопамі савецкага апарату.

Зусім недапушчальны таксама вельмі слабы ўдзел у працы на чысткі савапарату арганізацый камсамолу, асабліва груп «лёгкай кавалерыі». Адносна ролі друку трэба адзначыць, што, ня гледзячы на вялікую ролю яе, усё-ж не заўсёды мы наглядаем вядомы плян пасьлядоўнасьці, адзіную яскравую лінію ў яе працы па асьвятленьні чысткі партыі і савецкага апарату.

Тав. Назараў, урэшце, заклікаў партактыў рашуча ўзяцца за арганізацыю масавай дапамогі кантрольным органам у справе чысткі партыі і савецкага апарату на аснове разгортваньня самакрытыкі.

У спрэчках выступілі старшыня Мен. АКК т. Дамброўскі, т. т. Нароенка, Левін, Чарняўскі, Русецкі і інш. Частка таварышоў адзначала няўвязкі ў працы па чысткі савецкага апарату, дрэнную арганізацыю праверачных сходаў, якая фактычна не дае магчымасьці рабочым масам удзельнічаць у чысткі; некаторыя выключаныя з савецкага апарату, як шкодны і варожы элемэнт, надзвычайна хутка былі прыняты ў другія ўстановы і г. д.

Тав. Дамброўскі падзяліўся некаторымі вынікамі з чысткі вайсковых і вясковых ячэек Менскай округовай партарганізацыі.

Значнае месца ў спрэчках было аддана ролі друку. Тав. Левін лічыць, што «Зьвязда» ў апошні час зрабіла зусім недапушчальныя памылкі. Як інакш кваліфікаваць артыкул у «Зьвязьдзе» «Залатая рэзалюцыя аднаго Акругкому», дзе вельмі правільна ацэньваюцца памылкі акругкому, але не хапае толькі аднаго—паказаньня, які-ж гэта акругком. Ці можна мабілізаваць партмасы на барацьбу з няправільнай лініяй гэткага акругкому? Гэтага нельга зрабіць таму, што ні Менская, ні Віцебская і г. д. арганізацыі ня ведаюць, да каго артыкул адносіцца і таму ён (артыкул) ніякай карысьці партыі ня прынёс.

Ці вось другі прыклад. Газэта «Зьвязда» ў свой час зьмясьціла вядомы артыкул Сталіна, які быў асуджан ЦК УсеКП(б). Рэдакцыя зьмяшчае гэту пастанову ЦК УсеКП(б), замоўчваючы аб сваёй памылцы, і толькі праз некаторы час пасьля гэтага «Зьвязда» прызнала сваю памылку.

Далей. Вельмі дрэнна, што калі «Зьвязда ўзьнімае вялікія пытаньні, ні, гэтыя пытаньні не падхватваюцца парторганамі.

«Зьвязда» зьмясьцілася артыкул выключна вялікага асабліва ва ўмовах Беларусі—значэньня «Правы ўхіл у нац. палітыцы».

Ці мабілізавалі парторганы партмасы на абмеркаваньне гэтага артыкулу? Ці заслухалі і абмеркавалі парт'ячэйкі на сваіх сходах гэта пытаньне? Прыходзіцца адказаць, што пакуль што мы гэтага не наглядалі.

Ці вось другі прыклад, які паказвае, што на пытаньні, што ўзнімаюцца ў «Зьвязьдзе», няма ніякага рэагаваньня. Колькі раз «Зьвязда» пісала аб буйных памылках часопісі «Полымя». А між тым «воз и ныне там». Ніякіх зьмен у гэтым пытаньні няма. Усё застаецца так, як быццам нічога ня здарылася, нічога ня пісалі.

Між тым, іменна на такіх канкрэтных пытаньнях трэба было выхоўваць партмасы у барацьбе з ухіламі, з нездаровымі зьявішчамі, за рашучую сапраўдную самакрытыку.

Наш друк таксама не скарыстаў у мэтах выхаваньня мас на канкрэтных справах—факт аслабаненьня т. Валіцкага ад абавязку наркамасьветы.

У друку і на сходах гаварылася ня раз аб палітычных памылках і правах нацыянал-дэмакратычнага ўхілу у НК Асьветы і ў першую чаргу т. Валіцкага. Між тым, гэтымі днямі ў друку зьмяшчаецца кароценькае афіцыйнае паведамленьне аб аслабаненьні т. Валіцкага бяз усякага тлумачэньня ў асобных артыкулах, ці больш падрабязных пастановах кіруючых органаў, чаму адбылося зьняцьце т. Валіцкага. Каб рабочыя масы сапраўды ведалі, як партыя рэагуе на правы нацыянал-дэмакратычных ухілаў, трэба было наогул паведаміць грамадзкую думку аб матывах зьняцьця наркома.

У заключным слове тав. Кананаў адказаў на ўсе пытаньні, узьнятыя ў спрэчках.

АД РЭДАКЦЫІ: З прычыны выступленьняў т. т., якія паказвалі на памылкі «Зьвязды», рэдакцыя лічыць патрэбным адзначыць наступнае:

1) Чаму ў фэльетоне «Залатая рэзалюцыя» ня была абазначана назва акругкому,—рэдакцыя адказала у № 204 на ліст т. Когана. У гэтым жа адказе мы сказалі, што гутарка ідзе аб Віцебскім акругкоме КП(б)Б.

2) Палітычная памылка ў зьмяшчэньні артыкула Сталіна прызнана рэдакцыяй праз газэту 18-га жніўня г. г.

3) Побач з гэтым нельга абыйсьці і таго, што «Зьвязда» першая сыгналізавала аб праяўленьнях нацыянал-дэмакратызму.

Сьляпыя абсьледвацелі і становішча парт'ячэйкі БСІКА

Зажым самакрытыкі, разлажэньне, сямейнасьць

Абсьледвацелі з Кастрычнікаўскага райкому капаліся ў пратаколах ячэйкі, ня цікавіліся жывымі сьведкамі ня ўцягвалі ў абсьледваньне рабочых

У гэтай заметцы мы хочам расказаць аб становішчы ў парт'ячэйцы БІКА, аб кіраўнікох ячэйкі, аб бясчынствах, якія накапіліся ў ячэйцы і ва ўстановах.

Перш, чым прыступіць да выкладаньня фактаў, мы зробім адну маленькую заўвагу. На шматлікіх заметках у газэтах «Зьвязда», «Рабочий» і «Акцябр», заявах вусных і пісьмовых райком стараў камісіі для расьсьледваньня. Гэтыя камісіі працавалі паказённаму. Менш за ўсё цікавіліся жывымі сьведкамі, а больш капаліся ў пратаколах і рэзалюцыях, пругожва напісаных і гаворачых аб тым, што ўсё добра. Праўда, адна камісія ў сваіх пастановах адзначала: скрыты антысэмітызм, адрыў верхавінкі ад мас, давала намёкі на правы ўхіл у практычнай рабоце выдатнага кіраўніка БІКА і г. д., і г. д., але камісіі, ня гледзячы на факты, адносіліся да кіраўніцтва прымірэнча і ніякіх рашучых вываду не рабілі. У выніку да чысткі партыі мы маем у ячэйцы аформленую кругавую паруку, сямейнасьць з боку кіраўнікоў, якія аб'ядналіся і адзіным фронтам абараняюцца ад выкрыцьця, пакрываюць і выратоўваюць «ад бяды» адзін аднаго. І зусім ня дзіўна тое, што яны лоўка хаваюць капцы ў ваду, яны-ж стаяць на чале ячэйкі і адначасова кіруюць прадпрыемствам. Каб ня быць галаслоўнымі, падамо факты. На чале бюро ячэйкі стаяць наступныя асобы:

Сушкевіч — сакратар ячэйкі, старшыня 5-й арцелі шаўцоў. У мінулым і сучасным — горкі п'яніца, скрыты антысэміт, мае вымову ў РСІ за антысэмітызм, у свой час быў за гэта зьняты з работы. Растратчык (12 пар тамашэй і 70 пар дзіцячых загатовак), распусьнік, многажонец, нядаўна кінуў жонку і дваіх дзяцей. 5-та верасьня аб сакратары ў прысутнасьці 20 чал. рабочых-камуністых і камсамольцаў 5-й арцелі разгледалася пытаньне. Вы думаеце на бюро ячэйкі ці агульным сходзе ячэйкі — памыляецеся, чытачы... — пытаньне аб сакратары разьбіралася ў зачыненым габінэце Адзінцова, пад яго старшынствам. На гэтай нарадзе рабочыя-камуністыя расказалі, як Сушкевіч клікаў да сябе ў госьці для папоек і сам у сваю чаргу кадзіў піць да рабочых сваёй арцелі, як ён напляваўцельскі бюракратычна адносіцца да вытворчасьці і патраб рабочых. У часе службовых заняткаў ён прыводзіць на вытворчасьць жанчын для любоўных інтрыг, у паасобных цэхах (загатовачны) ня бывае цэлымі тыднямі, зусім не карыстаецца ніякім аўтарытэтам сярод рабочых 5-й арцелі.

Тав. Ганіч—кандыдат партыі, рабочы, на гэтай нарадзе заявіў, што за паўліта ў Сушкевіча можна дастаць рэкамэндацыю ў партыю і ён выступіць на бюро ў абарону, а без паўлітра ён будзе адцягваць прыём у партыю пад рознымі прычынамі.

5-я арцель уступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва, але толькі на паперы. У сапраўднасьці кіраўнік арцелі Сушкевіч праводзіць спаборніцтва па барацьбе з алькагалізмам, «хто больш вып'е», і па многажонстве. Заявы, што падаваліся праўленьню ўзімку, разглядаліся ўлетку.

У сваё апраўданьне Сушкевіч заявіў: «у адносінах многажонства гэта мая прыватная справа, з кім захачу з тым і жыць буду, нікому да гэтага справы няма і ніхто ў гэта ня можа ўмешваць, што датычыць выпіўкі, то п'ю я з камуністым, ад гэтага не адмаўляюся, і па тэты дзень».

Другім «гэроем» нашага бюро зьяўляецца вядомы па шматлікіх заметках рабкораў Адзінцоў, старшыня БІКА. Ён заг. АПА ячэйкі, дзякуючы яго рабоце мы яшчэ да гэтага часу не прапрацавалі пастановы 16-й партканфэрэнцыі, аб палітыка-выхаваўчай рабоце з-за адсутнасьці яе і гаварыць ня прыходзіцца.

Затое Адзінцоў пакрывае растратчыкаў, жандараў (Троцкі) і чужых нам элемэнтаў.

Ён акуратна і сыстэматычна дапамагаў прасьледаваць рабкораў (Міхальцоў, Гурэвіч, Каган, Шварц), зьмяшчаў людзей, якія мелі «доўгі язык». Гэта ён і цяпер склікаў нараду ў сваім габінэце, каб нагаварыць аб сакратары ячэйкі, сямейным чынам разрадзіць густую атмасфэру перад чысткай і схаваць капцы ў ваду.

«Рыбак рыбака пазнае здалёк». Як-жа ня ўзяць сакратара пад абарону, калі апошні будзе патрэбен і цяпер робіць вялікія паслугі... для абароны Адзінцова. Аб выкрытых бясчынствах ён загадаў пратаколу ня пісаць, пратакол-жа можа праліць сьвятло ў гнілое гняздо...

Трэці «гэрой» бюро ячэйкі — Ташкевіч — шваґер Сушкевіча. У часе кампаніі па падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі на агульным сходзе рабочых выявіў свой твар. Ён заявіў: «колькі мы ня будзем будаваць сацыялізму, нам яго не збудаваць, сацыялізм — опіум для народу».

Рабочая маса такой заяве дала рашучы адпор, падпісалася на 100 проц. месячнага акладу, а некаторыя і больш, як, напрыклад, рабочы Бэня падпісаўся на 500 руб. Характэрна тая акалічнасьць, што ў той час, калі рабочая маса арцелі абурана такім выступленьнем члена бюро, бюро ячэйкі ня думае нават абмяркоўваць выступленьня Ташкевіча.

У бюро-ж сядзяць свае людзі...

Ёсьць у бюро ячэйкі і прымірэнцы, якія сядзяць, пакрываюць і падпяваюць... Гэта, напершае, Пікус — старшыня шпвайнай 1-й арцелі, член бюро, быць сакратар ячэйкі двух складаў. Ён спалохаўся выкрыцьця існуючай кругавой парукі і перадаў сакратарства... Сушкевічу.

Падругое, Надзежын — сын папа, судзіўся і прыгавораны да году зьняволеньня за безгаспадарчасьць, працуе пад дырыжэрскай палачкай Адзінцова інструктарам па інваліднай каапэрацыі Менскае акругі. Трэба адзначыць яшчэ добра вядомага ў крымінальным вышуку і пракуратуры Лук'яновіча — былога старшыню 4-й арцелі «Перамога», пад кіраўніцтвам якога былі выкінуты на вецер 32.000 руб., які пры актыўнай дапамозе Адзінцова і Калініна быў фактычным прасьледвацелем рабкора Міхальцова і г. д. — у палітычных адносінах сапраўды паліттруп, які кампрамэтуе на кожным кроку сваімі паводзінамі партыю. Замест таго, каб вычысьціць яго з партыі, не чакаючы чысткі, бюро ячэйкі зьнімае яго з работы і падобраму «добрыя прыяцелі» рэкамэндуюць яму загадзя да чысткі зьмяніць службу і ячэйку. Цяпер Лук'яновіч служыць у Чырвоным Крыжы і ўцёк з бікаўскай ячэйкі. Такія адносіны бюро ячэйкі не выпадковыя. Лук'яновіч — стары бікаўскі пацук, ён доўга працаваў у БІКА і ведае шмат аб чым — пры сутычцы з рабочай масай у часе чысткі ён павінен быў-бы зрабіць справаздачу за свае грахі і расказаць аб грахох іншых бікаўскіх дзеячоў.

Нам застаецца спытацца райком партыі. Няўжо такі склад бюро можа ажыцьцяўляць палітычнае кіраўніцтва ячэйкай і прадпрыемствамі, якія налічваюць 500 рабочых і служачых. Атмасфэра ў ячэйцы БІКА распаленая, ніякага аўтарытэту бюро і кіраўнікі БІКА ў масах ня маюць.

Шмат і шмат фактаў рабочыя камуністыя расказвалі 5-та верасьня, гэтыя факты нідзе не запісаны і мы з-за адсутнасьці месца ня можам аб усіх напісаць. Але заместа пратаколу ёсьць жывыя сьведкі: 1) Шэвах, 2) Шапіра, 3) Рудзінскі, 4) Карчан, 5) Мэдрыж, 6) Ганіч і г. д.

Трэба аздаровіць зараз-жа ячэйку і кіраўніцтва інваліднай каапэрацыяй. Трэба сьмела, шырока разгарнуць самакрытыку на прадпрыемстве. Толькі яна выявіць усе нездаровыя месцы работы на прадпрыемстве, выведзе на чыстую ваду ўсіх брудных «гэрояў» у кіраўніцтве нашай ячэйкі, выкрые ўсе махінацыі, усе цёмныя справы, што творацца ў інваліднай каапэрацыі.

Мы высоўваем пытаньне аб датэрміновай чысткі нашай ячэйкі.

Група рабочых-членаў партыі

(подпісы 5 чалавек).

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы ліст—допіс групы рабочых мы пытаемся Кастрычнікавы райком КП(б)Б: 1) як мог ён прайсьці міма ўсіх гэтых фактаў у рабоце і кіраўніцтве парт'ячэйкі; 2) як рэагаваў райком на прымірэнчыя адносіны камісіі, вылучанай райкомам да нездаровых зьявішч, выкрытых у ячэйцы.

Ці мае БСІКА клясавы твар

Ці мае БСІКА клясавы твар?—вось гэта пытаньне вельмі патрэбна сёньня паставіць.

Як і з каго арганізаралася БСІКА? Раней існаваў саюз ваеннапалонных. У гэты саюз ваеннапалонных далучыліся старыя жандары, афіцэры царскай арміі, паліцэйскія чыноўнікі і розны крымінальны элемэнт. Члены гэтага саюзу, у часе яго існаваньня кадзілі ў камісарыят сацыяльнага забесьпячэньня і дабіваліся дапамогі. Членам гэтага саюзу ў свой час пачалі выдаваць дармовыя патэнты на права гандлю і, праўда, некаторая частка з іх пашла гандляваць. Другая-ж частка перапрадавала свае ільготныя патэнты прыватнікам, якія разгортвалі гандаль вельмі шпарка, бо патэнты ў іх былі дармовыя. У той-жа час пачалі арганізоўвацца і гандлёвыя арцелі. Першай была арганізавана сталоўка з моцнымі напіткамі, цэлы рад піўнушак і нават вінна-гастранамічныя магазыны, у арганізацыі якіх удзельнічалі вядомыя ў Менску былыя купцы 1-й гільдыі, кантрабандыстыя і нэпманы (Міленькі, Хаецкі, Рабіновіч), былыя жандары, белагвардзейскія афіцэры і інш. Побач з імі да інваліднай «каапэрацыі» прымазалася шмат жулікаў, прахадзімцаў. Некаторыя з гэтых сацыяльна-чужых і варожых нам элемэнтаў нават пралезьлі ў рады партыі.

Частка гэтых тыпаў займае адказныя пасады ў апараце БСІКА.

Да чагож даводзіць «кіраўніцтва» гэтых людзей? Што творыцца ў арцелях БСІКА?

Возьмем для прыкладу адну з арцеляй № 23 і праглядзім, хто зьяўляецца яе членамі. Былыя ўласьнікі гарбарань (Матвалінскі, Багдановіч, Хасяневіч, дамаўласьнікі, былыя крамнікі (Сьвяржыцкі, Каган Майсей, Пішчыкаў), былыяахранькі і жандары (Рымашэўскі, Троцкі)—вось хто напаўняе арцелі БСІКА. У складзе праўленьняў арцеляй тое-ж самае. У гэтай-жа арцелі № 23 старшынёю былы жандар Троцкі, сакратаром і казначэем Хасяневіч, старшынёю рэвізійнай камісіі былы памоцнік прыстава Рымашэўскі.

Большая палова членаў пятай шавецкай арцелі прайшла праз папраўчы дом, а частка і зараз знаходзіцца там.

Калі старшыні камісіі па чысткі арцелі т. Кушнэру задалі пытаньне, пі будуць выдалены з арцелі асобы, якія трапілі ў яе паміма аддзелу сацыяльнага забесьпячэньня, страхкасы і біржы, то тав. Кушнэр адказаў: «калі мы так станем чысьціць, то ад БСІКА застанецца толькі рожкі ды ножкі, то ад БСІКА застанецца толькі 25 проц. таго складу, які зараз ёсьць».

Склад БСІКА добра вядомы яго кіраўніку тав. Адзінцову, але ён нічога ня ўжывае, а нават заахвочвае прахадзімцаў. Аб гэтым можна падаць рад фактаў, якія засьведчаць гэты момант. Так, Адзінцоў выратоўваў ад арышту растратчыка Альбрэхта, які растраціў 6.000 руб. Адзінцоў удзельнічае ў папойках разам з кантрабандыстымі.—Міленькім (зараз загадчык сталоўкай БСІКА), па запісках Адзінцова яму выдаюцца з пякарні № 8 два мяшкі першагатункованай пшанічнай мукі. Гэта мука выдавалася быццам-бы для шавецкай майстэрні для клею. На запісках Адзінцова хто толькі хоча атрымлівае бяз грошай штодзенна белы хлеб. Адзінцоў акружыў сябе кулацка-нэпманаўскімі асобамі, элемэнтамі, якія пазбаўлены права голасу. Ён абараняе ўсіх гэтых асоб, якія цкуюць рабкораў, фабрыкуюць розныя фальшыўкі і рознымі агіднымі мэтадамі запалохваюць тых, хто спрабуе крытыкаваць.

Інструктар аддзелу сацыяльнага забесьпячэньня Сайкоў, як гэта выявілася пры расьсьледваньні справы растратчыкаў Баткова і Воранава, сыстэматычна браў прадукты в магазынаў бяз грошай, выявілася, што ён абвінавачваецца ў радзе крымінальных учынкаў.

Трэба наогул сказаць, што верхавінка БСІКА вельмі засьмечана, што гэтым прахадзімцам маса перастала верыць.

Трэба прызнаць, што камісія, якая праводзіла чыстку інваліднай каапэрацыі, сябе не апраўдала. Яна не ачысьцарцелі, яна не аздаровіла кіраўніцтва БСІКА.

ЗНАЁМЫ.

За бальшавіцкую цьвёрдасьць і маналітнасьць вясковых арганізацый*)

ШТО ПАКАЗАЛА ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА ВЯСКОВЫХ ПАРТ'ЯЧЭЕК МЕНСКУ

Як удзельнічалі беспартыйныя працоўныя масы ў генэральнай праверцы і чыстцы ячэек

Праверка і чыстка вясковых ячэек на акрузе праходзіла ў перыод касьбы і жніва, калі насельніцтва вёскі было занята работай. Аднак, ня гледзячы на гэта, зацікаўленасьць і ўдзел беспартыйных шырокіх батрацка-бяднацкіх і серадняцкіх мас на праверачных сходах быў вялікі

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПАТЭЛЕГРАФУ, ТЭЛЕФОНУ І ПОШТАЙ АД НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ

Як быў забіты вясковы актывісты тав. Фалько

Беднота патрабуе суровага пакаранья забойцы

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Наш кар.). 4-га верасьня гэтага году адбываўся пленум Грычанскага сельсавету з удзелам актыву, на якім абгаворвалася пытаньне хлебазагатовак і распаўсюджаньня трэцяе пазыкі індустрыялізацыі. На пленуме сельсавету вясковы актывісты т. Фалько выступаў і гаварыў, што плян загатовак трэба выканаць, трэба паставіць рашуча пытаньне, каб усё кулацтва і заможная частка вёскі здала хлеб дзяржаве. Акрамя таго, ён высоўваў пытаньне, каб ніводнай хаты не засталося без аблігацыі трэцяе пазыкі індустрыялізацыі.

Выступленьне тав. Фалько аднагалосна было падтрымана беднатою і актывам серадняцтва.

На кожным сходзе т. Фалько актыўна выступаў за правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў савецкае ўлады на вёсцы.

За сваю актыўную працу тав. Фалько быў абраны членам рэвізійнай камісіі Грычанскага сельсавету, членам праўленьня Фінпольскага спажывецкага кааперативу і членам праўленьня малочнага таварыства. За яго актыўную працу кулацтва ня раз пагражала забіць яго. У ноч з 4-га на 5-га верасьня кулакі свой агідны намер выканалі.

У вёсцы Васілеўшчына здарыўся пажар, куды выехаў тав. Фалько з Чаркаскай пажарнай дружынаю, старшынёю якое ён зьяўляўся. На пажары на яго напаў кулак з хутара Васілеўшчына Будай і сякераю забіў яго.

Нарада вясковага раённага актыву, якая адбылася 5-га верасьня па абгаварэньні пытаньняў хлебазагатовак і рэалізацыі 3 пазыкі індустрыялізацыі, заслухаўшы інфармацыю аб забойстве актывістага т. Фалько, пастанавіла прасіць судовыя органы прыстасаваць да забойцы вышэйшую меру пакаранья.

Прызыў на Гомельшчыне

Гомель (наш кар.). Падрыхтоўка да прызыву 1907 году разгортваецца. Сьлісы прызыўнікоў вывешаны на відных мясцох.

У Гомелі праведзена канфэрэнцыя прызыўнікоў, на якой многія прызыўнікі адмовіліся ад атрыманьня ільгот.

Такіх-жа канфэрэнцыі праводзяцца ў раёнах і ў буйных населішчах.

На прадпрыемствах праводзяцца гутаркі аб значэньні надыходзячага прызыву. У клюбах наладжваюцца вечары прызыву. Камсамол актыўна ўдзельнічае ў прызыве. Арганізавана камсамольская рота для праходжаньня курсу дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Асоавіяхім і МОПР наладжваюць у прызыўных пунктах свае гурткі для растлумачальнай кампаніі і вярбоўкі новых членаў.

Кааперацыйныя арганізацыі адчыняюць прадуктовыя ларкі. Настрой прызыўнікоў бадзёры.

Яшчэ не разварушыліся

Бабруйск (наш кар.). Сёлета на Бабруйшчыне складаецца пяць прызыўных пунктаў. На прызыў будуць выкліканы па нарадку цэлыя сельсаветы, у першую чаргу партыйцы і камсамольцы.

Да прызыву часу засталося небагата, а навакол яго яшчэ няма належнае грамадзкае думкі. Такая арганізацыя, як Авіяхім, амаль што нічога не зрабіла ў справе растлумачэньня сёлетняга прызыву, згуртаваньня навакол яго думкі сваіх членаў адпаведнай падрыхтоўкі дапамогі вайсковаму ведамству.

Толькі ў апошні час узяліся за правядзеньне канфэрэнцый прызыўнікоў па раёнах акругі.

Дайце настаўнікаў

БАРЫСАЎ (наш кар.). Па ўсіх гарадзкіх школах, якіх налічваецца ў Барысаве 15, ужо распачаліся заняткі. У вясковых школах заняткі пачнуцца 10 верасьня. Усімі школамі мяркуецца ахапіць 100 проц. дзядзей школьнага ўзросту.

Як гарадзкія, так сельскія школы дрэнна забясьпечаны праграмамі і падручнікамі.

У раёне не хапае 16 настаўнікаў.

Будаўніцтва больніц на Гомельшчыне

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Па Гомельшчыне разгорнута пабудова новых больніц. У Нова-Беліцы будуецца тубдыспансэр. У Лоеве пачалася пабудова больніцы на 12 ложкаў. На будаўніцтва гэтае больніцы адпушчана 65 тыс. руб. Намечана пабудова амбуляторнага пункту ў в. Савічы. Брагінскага раёну.

Курсы па перакваліфікацыі рабочых

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Акруговая інспэкцыя працы адкрывае курсы па перакваліфікацыі рабочых для швейнай прамысловасьці. Усяго на курсы залічваецца 300 чалавек.

ВЫНІКІ ДНЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ

У дзень калектывізацыі—28-га жніўня— уся грамадзкасьць гораду і вёскі, усе партыйныя, савецкія і кааперацыйныя арганізацыі на чале з рабочымі брыгадамі пайшлі ў калгасы, праводзілі на вёсцы вялікую работу на ўзмацненьні калгаснага руху на Беларусі, рабілі наступленьне адзіным фронтам на хутар, на кулацтва.

Гэты грамадзкі паход даў новую перамогу на фронце калгаснага будаўніцтва, уцягнуў у справу рэканструкцыі нашае сельскае гаспадаркі шмат новых вёсак, сотні і тысячы новых сялянскіх гаспадарак.

Паводле няпоўных вестак (ад 6 акруг) у дзень калектывізацыі арганізаваны 103 новыя калгасы на плошчы 30.819 гэкт., у тым ліку 9 калгасаў на плошчы ад 500 да 1000 гэкт. і 3 буйныя калгасы з плошчай звыш 1.000 гэкт. кожны.

Апрача таго, рад старых калгасаў узбуйніўся за кошт далучэньня навакольных сялянскіх гаспадарак на 6.733 гэкт.

Па Менскай і інш. акругах ёсьць выпадкі далучэньня да калгасаў у дзень калектывізацыі цэлых вёсак. Так, напрыклад, да калгасу імя Сталіна (Чэрвенскага раёну) далучылася вёска Очаны з 80 гаспадарак, да калгасу імя Абрамовіча (Капыльскага раёну) далучылася арганізавана 4 калгасы, у якія ўвайшлі 2 камсамольцы — самастойныя гаспадары, 9 камсамольцаў з гаспадаркамі бацькоў і шмат беспартыйнай моладзі.

У аднэй з вёсак сяляне сераднякі не згадзіліся з беднатой аб арганізацыі калгасу, але калі камсамольская ячэйка вынесла пастанову аб арганізацыі камуны і ў апошнюю ўвайшлі амаль усе камсамольцы, — то сяляне парашылі не адставаць і арганізавалі калгас. Зараз усяго ў раёне ў калгасах ёсьць 45 камсамольцаў.

Пры арганізацыі аднаго калгасу камсамолец-бядняк выступіў з заявай: «Лепш буду галодны і абадраны, але ў калгас ні ў якім разе не пайду».

Пасьля высьвятлілася, што гэты кулацкі падпявала выступіў супроць калгасу таму, што атрымаў ад заможнікаў хабар — кошык бульбы.

У в. Фашчоўка таксама два камсамольцы катэгарычна адмовіліся ўвайсьці ў калгасы.

Наогул, партыйная ячэйка і райком камсамолу мала рэагуюць на выпадкі правага ўхілу ў канкрэтнай рабоце па калгасным будаўніцтве.

У. С.

Бесьперапынны вытворчы тыдзень на фабрыцы „Дзьвіна“

Ватарнае аддзяленьне ільнапрадзільнай фабрыкі „Дзьвіна“ пераходзіць на бесьперапынны вытворчы тыдзень. Прэзыдыум саюзу тэкстыльшчыкаў прапанаваў адміністрацыі фабрыкі падрыхтаваць да пераходу на бесьперапыны вытворчы тыдзень чарэльнае і падрыхтоўчае аддзяленьне фабрыкі. Штаты рабочых, у зьвязку з гэтым, значна пашырэюцца. Фабкому даручана правесьці шырокую растлумачальную работу сярод рабочых аб значэньні гэтага мерапрыемства. Уся культурна-масавая работа прыстасоўваецца да новых умоў работы на фабрыцы.

Аб афармленьні падпіскі зусім забыліся

БАБРУЙСК. (Наш. кар.). Падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі на Бабруйшчыне на 1-ае верасьня дала наступныя вынікі: агульнае заданьне на падпісцы выканана на 106,2%, што дае 1.392 тыс. р. Па сялянскай падпісцы заданьне выканана толькі на 48,3 проц. Сума на сялянскай падпісцы дасягнула 126.175 руб.

Горад Бабруйск выканаў заданьне на 116 проц., Клічаўскі раён — на 111,5 проц., Чырвона-Слабодзкі — на 108,6 проц., Стара-Дароскі і Глускі выканалі толькі 50-60 проц. заданьня.

Што-ж датычыць чыста сялянскай падпіскі, дык шмат якія з раёнаў, што па агульнай падпісцы заданьне выканалі, па сялянскай падпісцы далёка адстаюць. Да такіх раёнаў трэба аднесьці: Асіпавіцкі раён (37 проц.), Клічаўскі (6,5 проц.) і г. д. Пасьпяхова праведзена падпіска на пазыку сярод сялянства па Слуцкім раёне (108 проц.) і Любаньскім — (100 проц.).

Раёны на мясцох распаўсюджаньню пазыкі сярод сялянства не аддалі належнае ўвагі, ня выканалі асноўнай устаноўкі, якая ўзята па рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Вельмі дрэнна стаіць справа з афармленьнем падпіскі. Па Бабруйску афармлена толькі 22 проц. падпіскі, па Сьвіслацкім раёне—37. Ёсьць нават раёны (Рашачоўскі і Асіпавіцкі), дзе афармленьне ледзь-ледзь дае адзін-паўтара процанты.

У фонд індустрыялізацыі краіны

ЖОДЗІНА (наш кар.). Сяляне Жодзінскага сельсавету ў дзень калектывізацыі правялі збор ураджаю у фонд індустрыялізацыі краіны. Усяго за адзін дзень сабрана 140 пуд. збожжа і 35 руб.

Першыя на БССР хлебныя элеватары

Канчаткова вырашана пытаньне аб пабудове ў Воршы і Гомелі першых на Беларусі хлебных элеватараў ёмкасьцю ў 500 тысяч пудоў хлеба кожны. Кошт будаўніцтва вызначаны ў 2 мільёны рублёў. Мяркуецца, што пабудова элеватараў скончыцца да пачатку хлебазагатоўчай кампаніі 1930 году.

Як паведаміў упаўнаважаны Саюзхлеба тав. Каган, пабудова хлебных элеватараў зробіць пераварот ва ўсёй сыстэме захаваньня хлеба ў Беларусі.

Дагэтуль хлеб захоўваўся ў невялікіх складах, якія амаль ня былі прыстасаваны для гэтай мэты. Пабудова элеватараў дасьць магчымасьць лепш захаваць якасьць збожжа і патаніць кошт яго.

Зараз Саюзхлеб адчувае востры недахоп у памяшканьнях для захаваньня збожжа. Прыняты рад рашучых мер да падшуканьня складаў на мільён пудоў хлеба. У Менску зараз канчаецца пабудова аднаго складу на 70 тысяч пудоў хлеба. Прыступлена да пабудовы ў Магілеве складу на 100 тысяч пудоў. Саюзхлеб адпусьціў таксама Гомельскаму сельхарчпрому сродкі на пабудову складу ёмкасьцю на 100 тысяч пудоў збожжа.

Ліст СНК аб асеньняй сяўбе

СНК БССР зьвярнуўся з лістом да ўсіх АВК, РВК і сельсаветаў аб асеньняй пасеўнай кампаніі гэтага году. У гэтым лісьце, між іншым, гаворыцца наступнае.

Матар'ялы праверкі праз выезды на месцы, а таксама весткі друку гавораць аб тым, што падрыхтоўка да асеньняй сяўбы слаба разгорнута. Асабліва зьвяртаюць на сябе ўвагу наступныя асноўныя недахопы:

Ва многіх раёнах пляны пасеўнай кампаніі не прасунуты да шырокіх мас сялянства, і самадзейнасьць сялянства навакол пытаньня сяўбы слаба арганізавана. Па цэлым радзе раёнаў ачыстка насеньня не разгорнута нават у разьмерах веснавога пэрыяду, хаця плянавае заданьне вышэй веснавога. Кантроль па выкананьні аграмінімуму арганізаваны слаба, і па некаторых раёнах аграмінімум у поўнай меры ня выконваецца

Нездавальняюча праходзіць кантрактацыя азімых (да канца-жніўня ўсяго 50 проц. заданьня). Як належыць агранамічна не абслугоўваюцца нанава арганізаваныя калгасы.

Ва многіх савецкіх гаспадарках, якія павінны ісьці ў першых радох па сваячасовым засеве і правядзеньні мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці, са спазьненьнем праходзіць абмалот, што можа адбіцца на сваячасовай здачы саўгасамі палепшанага насеньня для пашырэньня насенаводзтва. У саўгасах яшчэ не прыступілі да ачысткі сялянскага насеўнага матар'ялу.

Не разгорнута, як належыць, кампанія па рамонце сялянству сельска-гаспадарчага інвэнтару. Слаба праводзіцца вапнаваньне: вапнадрабільныя машыны ня толькі дастаўлены з спазьненьнем, але і дастаўленыя ўстанаўляюцца марудна — месяцамі замест тыдню, устаноўленыя драбілкі працуюць у адну зьмену з няпоўнай нагрузкай, сабекошт вапны перавышае ўсякія ўстаноўленыя нормы.

У лісьце паказваецца на тыя мерапрыемствы, якія зараз-жа трэба ўжыць у мэтах зьнішчэньня выяўленых адмоўных зьявішч.

Такім чынам, за 6 год па стварэньні **ваенная прамысловасьці выдатковавана звыш 80 мільёнаў даляраў.**

Такая гонка за пашырэньнем ваеннай прамысловасьці забясьпечвала да гэтага часу польскай буржуазіі поўнае здавальненьне патрэб арміі мірнага часу, дазваляе накапленьне мабзапасаў і нават вывяз зброі і рыштунку ў іншыя краіны, як, напр., у Румынію.

У адносінах патрэб арміі ваеннага часу, польская прамысловасьць ужо зараз забясьпечвае 50-60 проц.

Але, не абмяжоўваючыся гэтым, польская буржуазія ўжывае ўсе меры да мілітарызацыі ўсёй грамадзянскай прамысловасьці шляхам разьмяшчэньня часткі ваенных заказаў на грамадзянскіх прадпрыемствах, стварэньня ў іх спэцыяльных ваенных цэхаў і аддзяленьняў, шляхам выдачы крэдытаў, падатковых ільгот і г. д.

Ня гледзячы на дэфіцыт у хлебафуражы, **польская буржуазія імкнецца ўсімі мерамі падрыхтаваць да вайны і сельскую гаспадарку,** робячы асноўную стаўку ў пашырэньні хлеба-фуражнага балянсу на разьвіцьцё буйных кулацкіх і памешчыцкіх гаспадарак.

Для ваенна-эканамічнае падрыхтоўкі краіны ў 1926 годзе створан спэцыяльны «Камітэт абароны дзяржавы», а потым «Дзяржаўная эканамічная рада», задачай якое зьяўляецца вырашэньне важнейшых эканамічных праблем.

Ваенныя імкненьні польскай буржуазіі дайшлі да таго, што з 1927 году ў міністэрствах існуюць свае ваенныя аддзелы, якія ведаюць пытаньнямі мілітарызацыі тэй ці іншай галіны народнае гаспадаркі.

Вялізную ўвагу зварачае польская буржуазія на накапленьне мабзапасаў. Вось некаторыя лічбы аб гэтых выдатках. Па гадох: у 1923 г.—10 мільён. даляраў, у 1924 г.—14 міл. дал., у 1925 годзе—23 міл. дал., у 1926 г.—28 міл. дал., у 1927 г.—30 міл. дал., у 1928 г.—30 міл. дал., а ўсяго—135 мільён. даляраў.

Гады.	Укладаньні вайскова. міністэрства у дзяржаўную ваенную прамысловасьць.	Укладаньні замежнага капіталу у ваенную прамысловасьць.	Укладаньні ўраду на падрыхтоўку прыватнага капіталу да вайны.	Усяго
1923	4,5	1,5	5,0	11,0
1924	3,0	2,5	5,0	10,5
1925	4,0	2,5	7,0	13,5
1926	2,5	2,0	7,0	11,5
1927	2,0	2,5	10,0	14,5
1928	2,4	2,5	15,0	19,5
1929	2,5	—	—	—

Вось якая палітыка і практыка польскай буржуазіі ў падрыхтоўцы ўсёй гаспадарчай сыстэмы да вайны.

ВАЕННА-ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Мы бачылі, якіх вялікіх разьмераў дасягае польская армія, якой напружанасьці падлягае ўся краіна шалёнай падрыхтоўкай да вайны. Але і на гэтым ваенным падрыхтаваньні не абмяжоўваюцца. **Падрыхтоўка да вайны з СССР цесна ўвязваецца з разгромам рэвалюцыйнага руху ўнутры краіны.**

Згуртаваньнем усіх сіл рэакцыі, імкненьнем уключыць прафсаюзы ў фашысцкую дзяржаўную і грамадзкую сыстэму, насаджэньнем кулацтва на вёсцы, подкупам украінскай і беларускай буржуазіі, інтэлігенцыі і кулацтва, насаджэньнем асадніцтва, усямерным уцягваньнем насельніцтва ў фашысцкія вайсковыя арганізацыі, разгулам тэрору, шавіністычнай апрацоўкай салдата—усімі гэтымі мерапрыемствамі імкнецца польскі фашызм забясьпечыць посьпех барацьбы на ўнутраным фронце.

Мы спынімся толькі на пытаньні ваенна-грамадзкіх арганізацый, якое мае больш блізкія адносіны да нашай тэмы. У аблічы ваенна-грамадзкіх арганізацый фашызм бачыць сродак падрыхтоўкі патаемных навучаных рэзэрваў для арміі, сродак перавыхаваньня мас у фашысцкім духу, стварэньня «надзейнай» апорнай сілы фашызму. **Да ліку такіх арганізацый адносіцца «Стралец», «Сокал», «саюз унцер-афіцэраў запасу», «саюз афіцэраў запасу», «саюз інвалідаў», «саюз былх салдат», «саюз паўстанцаў», «ліга паветранай абароны дзяржавы», «саюз польскага гарцэрства» і г. д.**

Сярод усіх гэтых арганізацый вельмі важную ролю адыгрывае стралковы саюз «Стралец», які вядзе ваенную падрыхтоўку моладзі. «Стралец» налічвае каля 600 тысяч членаў. Фашызм уцягвае моладзь у гэты саюз самымі разнастайнымі мэтадамі. Як: ільготамі ў часе вайсковай службы, прадастаўленьнем работы ў адміністрацыйным апараце вёскі, арганізацыяй з членаў саюзу платных пажарных команд, вясковых аркестраў і інш. Разам з гэтым вядзецца ўзмоцненая ідэалёгічная апрацоўка рабочай і сялянскай моладзі.

Па-за вайсковую падрыхтоўку моладзі праводзяць і іншыя саюзы, як, напрыклад, «Сокал», «Саюз польскае дзяржавы» і г. д., якія налічваюць у сваіх радох дзесяткі тысяч членаў.

Буржуазія імкнецца, апрача таго, скарыстаць у мэтах мілітарызацыі спорт. Саюз рабочых спартыўных таварыстваў далкам пабудаваны на прынцыпах ваенна-фашысцкай падрыхтоўкі. Ахват спартыўнымі таварыствамі моладзі вельмі вялікі. Так, да 1929 году налічваецца ў гэтых арганізацыях 223.931 чал., супроць 115.643 чал. у 1925 г.

Ва ўсе грамадзкія добраахвотныя арганізацыі шырока ўцягваюцца жанчыны, дзе яны перш за ўсё спэцыялізуюцца разьведчыкамі і сувязістымі.

У мэтах ваеннай-жа падрыхтоўкі насельніцтва, на фабрыках, заводах і ў школах стварацца спэцыяльныя атрады ваеннага навучаньня, прычым у радзе школ ваенная падрыхтоўка носіць прымусовы характар.

У апошні час большасьць ваенных саюзаў аб'ядная ў «фэдэрацыю саюзаў абаронцаў бацькаўшчыны».

Кіруючая роля ў гэтай фэдэрацыі фактычна перадана саюзу легіянэраў, які зьяўляецца сапраўднай гвардыяй фашызму. Саюз легіянэраў налічвае каля 300 тысяч.

Агульная колькасьць членаў ваенных саюзаў Польшчы, паводле няпоўных даных, вылічваецца звыш 1 міл. 100 тысяч чалавек. Наколькі польскі фашызм пасьпявае ў гэтым пытаньні, можна меркаваць з таго, што ва ўсіх пагранічных з Савецкім Саюзам дзяржавах ваенныя саюзы, разам узятыя, маюць 280 тысяч чалавек.

Б. ПАПОЎ.

(Працяг будзе)

Падрыхтоўка польскага фашызму да нападу на СССР*)

Ваенна-морскі флёт. Згодна Вэрсальскага дагавору Польшча атрымала ад Нямеччыны 6 мінаносцаў і 4 тральшчыкі. Да 1924 году былі ўжо набыты яшчэ 2 канапэрскія лодкі, 4 тральшчыкі і 4 дапаможныя судны і катэры. Паводле пляну, прынятага Пілсудскім у 1927 г., намечана да пабудовы к 1932 году 6 эскадраных мінаносцаў і 9 падводных лодак. Разам з гэтым Францыя зданы заказы на пабудову 2-х эскадраных мінаносцаў і 3 падводных лодак. Увесну гэтага году спушчаны на ваду мінаносец «Віхор» і тры падводныя лодкі: «Вільк», «Жбак» і «Рысь».

Заканчваецца пабудова ваеннага порту Гдыня, ня гледзячы на тое, што Польшчы было прадастаўлена права мець сваю ваенна-морскую базу ў Данцыгу.

Узмацненьне ваеннае тэхнікі. У справе дасягненьня адпаведнасьці стрэльбаў, за апошні час у польскай пяхоце ёсьць значныя посьпехі. Так, да гэтага моманту, замест меўшых месца некалькіх розных сыстэм (нямецкіх, францускіх, расійскіх і аўстрыйскіх), пяхота на 70 проц. пераўзброена стрэльбамі аднэй сыстэмы «Маўзэр». Рэшта—30 проц.—выключна францускімі. Мабілізацыйны запас забясьпечвае ўзбраеньне ўсёй чынной арміі стрэльбамі «Маўзэр».

Удасканальваецца сыстэма ўзбраеньня пяхоты і кавалерыі аўтаматычнай аброяй.

Кулямёты «Браўнінг» якія адзначаюцца лёгкай вагой, хуткай страляніной і прастатою канструкцыі, паступова замяняюць сабою менш дасканалы кулямёт «Шоша».

10.000 кулямётаў «Браўнінг» заказала Польшча заграніцай, больш іх робіцца і на сваіх заводах.

Станковыя кулямёты «Максім» замяняюцца сыстэмай «Готчыса», больш надзейнай у рабоце.

Артылерыя цяпер поўнасьцю ўзброена лепшай з усіх эўрапэйскіх лёгкіх палявых гармат—75 мм. францускай гарматай. Добрыя сыстэмы гармат мае і пяхкая артылерыя.

У кавалерыі ўводзяцца 6-калёсныя тачанкі для перавозкі цяжкіх кулямётаў.

Ваенная прамысловасьць. Улічваючы, што ў баявых адносінах армія ня можа быць забясьпечана поўнасьцю за кошт прывозу з-за граніцы, польская буржуазія напружвае ўсе сілы да ўсямернага пашырэньня ўласнай ваеннай прамысловасьці. Гэта работа вядзецца як на лініі будаўніцтва новых спэцыяльна-ваенных заводаў, так і па лініі арганізацыі ваеннае вытворчасьці на буйных прамысловых прадпрыемствах.

У выніку, замест 5-ці ваенных заводаў, якія меліся да 1923 году (стрэльбавага, патронна-знарадная, трубачнага і двух парахавых), у даны момант у Польшчы ёсьць 38 ваенна-прамысловых прадпрыемстваў, якія працуюць для патрэб арміі. Цэлы рад прыватных заводаў і фабрык апрача таго выконвае ваенныя заказы.

Укладаньні міністэрства вайсковых спраў і прыватнага замежнага капіталу па гадох відны з наступнай табліцы, у мільёнах даляраў:

*) Працяг. Пачатак глядзі ў нумары 204.

Перад баявой праверкай

МАНЭЎРЫ ПАКАЖУЦЬ НАШУ ЗДОЛЬНАСЬЦЬ ШПАРКА ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ВАЕННЫЯ РЭЙКІ.--БУДЗЕМ ГАТОВЫ ВА ЎСІХ ГАЛІНАХ РАБОТЫ

Экзамен вытрымаем

Зараз ужо можна падагуліць папярэднія вынікі гатоўнасьці нашай пралетарскай грамадзкасьці да надыходзячых манэўраў.

Трэба адзначыць, што **з боку партыйных і грамадзкіх арганізацый пытаньню падрыхтоўкі манэўраў зьвернута вялікая ўвага і прароблена вялізная работа.**

Мы можам сьмела заявіць, што сустрэнем манэўры падрыхтаванымі. Рад арганізацый справіліся са сваімі задачамі вельмі добра. Да ліку такіх раней усяго можна аднесьці Чырвоны Крым, Белкаапсаюз, арганізацыі культурнага абслугоўваньня часьцей і інш.

Але штоасабліва каштоўна, дык гэта тое, што важнасьць надыходзячых **манэўраў моцна ўвайшла ў сьвядомасьць працоўных мас,** якія праяўляюць самыя разнастайныя формы актыўнасьці ў падрыхтоўцы да манэўраў і вельмі ўважліва адносяцца да чырвоных байцоў.

Але, адзначаючы гэтыя вялізныя посьпехі, мы павінны не забыць і пра слабыя вучасткі работы каб зараз-жа ўзяцца за іх падцягваньне.

Тут мы раней усяго павінны адзначыць, што **наогул у параўнаньні з усімі акругамі БССР, найбольш слаба абстаіць з падрыхтоўкай манэўраў у Магілеўскай акрузе.** Асабліва слаба тут разгарнулася масавая работа. Вельмі мала агітатараў. **Акругком партыі, як відаць, не праявіў адпаведнае ўвагі.**

Што датычыць асобных партарганізацый, дык ёсьць таксама яшчэ рад недахопаў.

Так, калі акруговыя арганізацыі Асоавіяхіму самі, параўнаўча, падрыхтаваліся, дык **на мясцох ячэйкі Асоавіяхіму адчуваюцца вельмі слаба.** Відавочна, акруговыя саветы ня здолелі яшчэ стварыць наўкола сябе нізавы актыў. Ня прымаюцца належныя меры да арганізацыі і замацаваньня ініцыятывы мас, не даволі разгорнута работа па вярбоўцы новых членаў, па пашырэньні гуртко́ў, паляпшэньні ваенных куткоў і г. д. **Прафсаюзы слаба праводзяць работу ў зьвязку з манэўрамі сярод батрацтва і с.-г. рабочых.** Праўда, у гарадох праведзена вялізная работа. Ня дрэнна падрыхтавана настаўніцтва.

Трэба ўзяцца зараз-жа за выпраўленьне гэтых слабых месц. Трэба адначасова старацца маўчыма пырэй **папулярызаваць тыя формы дапамогі арміі, якія найбольш будуць карысны для яе баявой вучобы.** Сюды адносіцца: рамонт дарог і мастоў мясцовага значэньня, ахова тэлефонна-тэлеграфных ліній, вылучэньне дзяжурных груп праваднікоў, пытаньні разьмяшчэньня часьцей па хатах, барацьба з антысанітарыяй, стварэньне каманд для сувязі, арганізацыя сустрэч і г. д.

Аўтадору трэба шырока скарыстаць манэўры для папулярызацыі сваёй работы, зьвязваючы яе **з вялізнай актыўнасьцю па рамонце дарог,** якая зараз мае месца.

Трэба яшчэ раз праверыць сваю работу, зьнішчыць асобныя промахі.

Зроблена ўжо шмат. Трэба яшчэ лепш узяцца за далейшую падрыхтоўку.

У нас ёсьць усе падставы ужо зараз заявіць, што пралетарская грамадзкасьць на манэўрах поўнасьцю вытрымае свой экзамэн.

Спажывецкая кааперацыя павінна забясьпечыць манэўруючыя часьці усім патрэбным

(Гутарка з нам. старшыні праўленьня Белкаапсаюзу т. Хаскіным)

Перад спажывецкай кааперацыяй у сувязі з надыходзячымі манэўрамі стаяць вялізныя задачы. У часе манэўраў яна павінна давесьці на справе, што ў патрэбны момант здолее абслугоўваць Чырвоную армію ў сэнсе забясьпечэньня яе патрэбнымі прадуктамі і таварамі.

Беларуская спажывецкая кааперацыя не ўпяршыню прымае ўдзел у манэўрах, мае ў гэтай справе практыку, ведае свае недахваты. Зараз мы павінны адпаведным чынам падрыхтавацца, каб сапраўды з гонарам вытрымаць гэты экзамэн.

Кожны чырвонаармеец, кожны камандзір і палітработнік павінны сустрэць з боку працаўнікоў кааперацыі належную ўвагу, ветлівыя і чулыя адносіны да сябе. Кааперацыя павінна іменна зараз, па справе давесьці, што яна зьяўляецца для чырвонаармейца блізкай і сутаварыскай арганізацыяй.

Абарона краіны ад імпэрыялістых зьяўляецца аднэй з найбольш важных задач спажывецкай кааперацыі. Падзеі на савецка-кітайскай граніцы абавязваюць нас больш, чым калі-б там ні было, зьвярнуць увагу на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны. У праверцы нашай гатоўнасьці павінны прыняць удзел ня толькі нашы непасрэдныя працаўнікі кааперацыйнага апарату, але ўся маса пайшчыкаў і ў першую чаргу кааперацыйны актыў. Кааперацыйны актыў павінен тлумачыць насельніцтву значэньне манэўраў для абароназдольнасьці краіны, на якіх мы выяўляем свае сілы і сваю баявую гатоўнасьць. Кожная кааперацыйная крама павінна таксама стаць культурным цэнтрам.

Маса пайшчыкаў і ўся савецкая грамадзкасьць павінны праверыць у зьвязку з манэўрамі, наколькі спажывецкая кааперацыя здольна хутка пераключаць сваю работу на рэйкі абароны краіны для гаспадарчага і культурнага абслугоўваньня РСЧА. Хуткасьць і гібкасьць патрэбны ад кааперацыйнага апарату і ад усяго каапактыву. **Манэўры ў гэтым сэнсе павінны быць лепшай праверкай барацьбы з бюракратызмам і цяганінай, асабліва ў кааперацыйных арганізацыях, якія павінны прыкладна абслугоўваць манэўры РСЧА.**

Забясьпечым манэўры добраякасным хлебам

Рабочыя Менскага хлебазаводу прапануюць арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае забясьпячэньне манэўруючых часьцей хлебам

Набліжаюцца вялікія манэўры. Няма чаго і гаварыць, што яны маюць вялізнае значэньне і наўкола іх павінна быць мабілізавана ўвага ўсіх арганізацый.

Перад рабочымі-пекарамі стаіць вельмі важная задача—забясьпечыць манэўруючыя часьці добраякасным хлебам.

Рабочыя-харчавікі павінны давесьці на справе, што ў патрэбную хвіліну яны змогуць мабілізаваць усю сваю творчую ініцыятыву на дапамогу Чырвонай арміі.

Мы, група рабочых Менскага хлебазаводу, уносім прапанову—арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж хлебазаводамі і забясьпечваючы арганізацыямі Аршанскай, Бабруйскай, Магілеўскай, Гомельскай і нш. акруг на лепшае забясьпячэньне манэўруючых часьцей добраякасным хлебам.

Акрамя таго мы прапануем арганізаваць спаборніцтва паміж працаўнікамі прыпаўку на лепшае абслугоўваньне чырвонаармейцаў.

Мы патрабуем ад «трыкутніка» нашага заводу і Беларускага камітэту саюзу харчавікоў вывучэньня нашай прапановы хуткага правядзеньня яе ў жыцьцё.

Група рабочых Менскага хлебазаводу:
ЧАШУНІН, ЯКУБОЎСКІ, НІСЭНБАУМ, ПАЎКОЛАС, РЭЦІК.

Белдзяржкіно да манэўраў

У Белдзяржкіно нам паведамілі аб наступным:

Для культурнага абслугоўваньня ўдзельнікаў манэўраў бранёвыцца спэцыяльныя кіно-карціны з належным зьместам. Будуць абслугоўвацца ня толькі чырвонаармейцы, але і вакольчае насельніцтва.

Надрукованы лёвунгі, якія будуць укліньвацца ў кіно-іст.жкі. Выпускаецца некалькі нумароў вайсковай хронікі ў выглядзе часопісі. Вызначаны спэцыяльныя сілы для здымкаў манэўраў. Распачата падрыхтоўка да таго, каб утвораныя здымкі на месцы праяўляць і тут-жа дэманстраваць перад удзельнікамі.

У раён манэўраў ужо перакідваецца рад перасовак.

Д. М.

РАБОТУ ФІНОРГАНАЎ ПАД КАНТРОЛЬ МАС!

ЧАМУ ЗВЫШ 2-Х МІЛЬЁН. РУБ. ДЗЯРЖАЎНАГА ПАДАТКУ ЗАСТАЮЦЦА У КІШЭНЯХ НЭПМАНАЎ

ЗАНЯПАД ПАДАТКОВАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ. АДСУТНАСЬЦЬ ЦЬВЁРДАЙ БАРАЦЬБЫ З НЯДОІМАЧНАСЬЦЮ. ПРЫГАВОРАНЫЯ ДА ЗЬНЯВОЛЕНЬНЯ НЭПМАНЫ-НЯДОІМШЧЫКІ ШПАЦЫРУЮЦЬ ПА ГОРАДЗЕ

Акрфінаддзелы займаюцца дыплёматыяй з буйнымі гандлярамі

Пытаньні падатковай нядоімачнасьці пачынаюць набываць у нашай рэспубліцы вялізнае гаспадарчае і палітычнае значэньне. Нядоімачнасьць у Беларусі на 1-га ліпеня дасягнула 3 млн. рублёў і выказвае тэндэнцыю да далейшага росту. У той час, як нядоімачнасьць аграмаджанага сэктару выражаецца ў суме 700 тысяч рублёў, нядоімачнасьць прыватнага сэктару дасягнула вялізарнай сумы ў 2.300 тысяч руб.

За 3 квадру гэтага году нядоімачнасьць прыватніка ў Полацкай акрузе ўзрасла на 50 проц., у Магілеўскай — на 36,9 проц., у Менскай — на 48 проц., Гомельскай — 35,6 проц. Нядоімачнасьць па аграмаджаным сэктары за гэты-ж пэрыяд часу павялічылася ў Аршаншчыне на 223 проц., Магілеўшчыне — на 156 проц., Гомельшчыне — на 43 проц., Некаторае паляпшэньне мы маем толькі па Віцебскай акрузе, дзе за трэцюю квадру нядоімачнасьць паменшылася на 20,5 проц.

Тлумачэньне такога вялікага росту нядоімачнасьці ў БССР — у адсутнасьці падатковай дысцыпліны сярод усіх катэгорый падаткаплацельшчыкаў, у слабой рабоце фіскальных органаў і ігнараваньні пастаноў ураду аб мерах барацьбы з нядоімачнасьцю. Да гэтага трэба яшчэ дадаць непрыцягненьне грамадзкасьці да работы па ліквідацыі нядоімачнасьці.

У красавіку гэтага году прадстаўнікі НК РСІ Саюзу правяралі, наколькі ў Беларусі выконваюцца пастановы саюзнага СНК аб барацьбе з нядоімачнасьцю. Таксама і НК РСІ БССР праяраў становішча з нядоімачнасьцю ў трох нашых акругах — Менскай, Гомельскай і Віцебскай. На тэму аб узмацненьні барацьбы з нядоімачнасьцю напісана куча папер — а «а воз и ныне там». Становішча не паляпшаецца, а пагоршваецца. Нядоімачнасьць, як сьнежны камяк, што коціцца з гары, усё навялічваецца.

За прыватнікам налічваецца нядоімка ў 2.300.000 руб.

Пераважная частка гэтай вялізнай сумы зьяўляецца зусім рэальнай да паступленьня. Зарэзумела, спагнаньне гэтых грошай зьвязана з пэўнымі труднасьцямі. Нядоімшчыкі пачалі ўтойваць маемасьць, якая можа скарыстоўвацца для забясьпячэньня запазычанасьці. Нядоімшчыка таму прыходзіцца прымушаць, каб ён плаціў, і меры прымушэньня прыходзіцца ўзмацняць.

НК РСІ Саюзу ўлічыў гэту акалічнасьць і

Закандаевым—ня месца ў радох савецкіх спэцыялістых

Пастанова Менскага Вучпрафсожу

Прэзыдыум Менскага вучпрофсожу МББ чыг. зацьвердзіў пастанову бюро ІТС Менскага вузла аб выключэньні інж. Закандаева з радоў ІТС.

Прэзыдыум асудзіў антысавецкае выступленьне Закандаева і прызнаў немагчымым застаўленьне яго на кіруючагаспадарчай рабоце. Гэта пытаньне пастаўлена перад праўленьнем дарогі.

Прэзыдыум выказаў упэўненасьць, што інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі, у адказ на панічныя выступленьні пасобных спэцыялістых, якія ня вераць у выкананьне пяцігодкі, — будуць яшчэ з большым энтузіязмам будаваць сацыялістычную гаспадарку. Прэзыдыум прызнаў неабходным правесьці агляд работы 5-га вучастку аддзелу пуці, для чаго арганізаваць часова-кантрольную камісію.

— Яшчэ большае разгортваньне самакрытыкі, яшчэ большае ўцягненьне рабочых мас у сацыялістычнае будаўніцтва, яшчэ большае ўзмацненьне рабочага кантролю — лепшы адказ на панічныя настроі і выступленьні — гаворыцца ў пастанове вучпрафсожу.

Белдзяржбуд не клапаціцца аб патаненьні будаўніцтва

Праектнае бюро прытрымліваецца старых правіл канструкцыі

Нядаўна ў «Рабочем» была зьмешчана заметка аб тым, што праектбюро Белдзяржбуду ў сваіх работах упускае з-пад увагі пытаньні рацыяналізацыі, і заместпатаненьня атрымліваецца падарожнае будаўніцтва.

У заметцы расказана было аб праектаваньні занадта глыбокіх фундамантаў для унутраных сьцен (Дзяржбанк), аб ладзьнайна магутных калёнах з таўрабых бэлек.

На жаль, будаўніцтва Дзяржбанку ня робіць выключэньня.

Прыйшлося нам быць гэтымі днямі на пабудове кандытэрскай фабрыкі, дзе работы праводзіць таксама Белдзяржбуд. І там мы спаткаліся з тым-жа зьявішчам: тыя-ж «запасы моцы» ёсьць і тут. Зьдзіўляе магутнасьць жалезных бэлек міжпавярховых перакрыцьцяў. Калі-б заместтаго мора жалеза, якое ўжыта на гэты будынак, ўжыць жалезна-бэтонныя рабрыстыя перакрыцьці, можна было б эканоміць 75 проц. выдаткаванага жалеза.

Праектбюро Белдзяржбуду аб гэтым не падумала, а вырашыла задачу па старынцы: больш жалеза — больш упэўненасьці ва ўстойлівасьці канструкцыі. А што яно каштуе шмат даражэй, што двутаўравых бэлек у нас наогул недахоп — да гэтага яму клопату мала.

Заслугоўвае ўвагі і тое, што тэхнагляд з боку Хартрэсту таксама не пацікавіўся аб патаненьні будаўніцтва. Трэнна яшчэ пастаўлена ў нас рацыяналізацыя будаўніцтва. Шмат яшчэ ў гэтай галіне трэба зрабіць.

КУЛЬКІН.

ПАДПІСАНЬНЕ ДАГАВОРУ

на сацыялістычнае спаборніцтва паміж камсамолам Кіеву і Менску

Падрыхтоўка да Усебеларускай с.-г. выстаўкі

Дырэкцыя Ўсебеларускай с.-г. і прамысловай выстаўкі запрасіла ў якасьці кансультанта былога старшыню камітету ўсесаюзнай с.-г. выстаўкі тав. **Лебедзева.**

Тав. Лебедзеў азнаёміўся з ходам падрыхтоўкі да выстаўкі ў Менску і на пасяджэньні дырэкцыі выказаў свае думкі аб тым, якой павінна быць усебеларуская с.-г. выстаўка.

— Падрыхтоўчая работа,—кажа тав. Лебедзеў,—праходзіць здавальняюча, але яна зараз павінна перайсьці ў другі пэрыяд—пэрыяд мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньняў выстаўкі.

Адпушчаных сродкаў мала для таго, каб пабудаваць такую выстаўку, якая змагла-б выканаць пастаўленыя задачы. Асыгнаваньне трэба павялічыць.

Праграма выстаўкі, па думцы тав. Лебедзева, павінна быць перабудавана. У прыватнасьці, севазвароты павінны паказаць, па якіх шляхох у далейшым пойдзе сельская гаспадарка Беларусі. Тут трэба асабліва выдзеліць момант калектывізацыі. Тэрыторыю трэба так распляніваць, каб выстаўка дала наведвальніку адразу цэлае ўражаньне.

Тав. Лебедзеў лічыць, што на тэрыторыі выстаўкі трэба стварыць сталае месца для масавых гуляньняў, заняў для пасяджэньняў і тэатральных пастановак, сталоўку, што не прадугледжана існуючым праектам.

Зусім ненармальна, што асеньняя пасеўная кампанія не скарыстоўваецца для папулярызацыі сярод насельніцтва ідэй і мэтаў выстаўкі.

Дырэкцыя згадзілася з вывадамі тав. Лебедзева. Пастаноўлена ўзбудзіць хадайніцтва перад СНК аб водпуску дадатковых сродкаў.

Пабудова павільёнаў на некалькі дзён спынена.

Работа зноў распачнецца ў бліжэйшыя дні і будзе весьціся пад наглядам тав. Лебедзева і маскоўскага архітэктара, які прыяжджае ў Менск.

Аб забесьпячэньні рабочых Менску таварамі

Нядаўна адбыўся пленум каапэрацыйных камісій г. Менску, на якім старшыня МЦРК т. Кац зрабіў даклад аб пэрспэктывах забесьпячэньня таварамі рабочых. Тав. Кац адзначыў, што дзякуючы ўвядзеньню заборных кніжак і інш. свячасова прынятым мерапрыемствам у нас у сучасны момант становішча з хлебам стала ўстойлівае. Калі ў мінулым годзе было загатоўлена хлеба на 2.980 тыс. руб., дык у наступным годзе будзе загатоўлена на 4.200 тыс. руб. Такім чынам, норма водпуску хлеба будзе павялічана, але ў мэтах эканоміі і плянавасьці ў разьмеркаваньні хлеба заборныя кніжкі застануцца і на далейшы час.

Зараз ЦРК мае запасу розных круп у 6 вагонаў і макаронаў тры вагоны. На наступны с.-г. год будзе закуплена 130 вагонаў крупы і 30 вагонаў макарон, на суму 580 тыс. руб.

Горш абстаіць справа з мясам. Водпуск мяса будзе нармаваны. Зусім дрэнна пастаўлена забесьпячэньне насельніцтва малаком. Гораду патрэбна ў дзень 38 тыс. літраў малака, а адпускаецца толькі 8-10 тыс. літраў у дзень. У будучым водпуск малака мяркуецца павялічыць да 20 тыс. літраў ў дзень. Таксама з адкрыцьцём цэнтральнай малочнай палепшыцца тэхніка водпуску малака, будуць зьнішчаны чаргі.

ЦРК у бліжэйшы час адкрывае яшчэ 65 новых крам, якія будуць пераведзены на непарыўны гандлёвы тыдзень.

Справа грамадзкага харчаваньня палепшыцца толькі тады, калі будзе пабудавана фабрыка-кухня.

Абсталяваньне—для Асінбуду

Галоўны інжынэр выяжджае замяжу

Галоўны інжынэр Асінбуду тав. Алейнікаў выяжджае ў Нямеччыну, Францыю і Швэцыю для азнаямленьня з работай турбагэнэратараў. У Швэцыі ён будзе прысутнічаць пры выпрабаваньні машын і прымаць закаваныя для Асінбуду турбагенэратары.

Тав. АЛЕЙНІКАЎ азнаёміцца таксама замежамі з электрыфікацыяй сельскай гаспадаркі, каб прыстасаваць замежны вопыт у Беларусі.

МЕНСК

30 тысяч пудоў палепшанага насеньня бядняцкім гаспадаркам

Наркамзем па ўзгодненьні з ЦК сялянскай узаемадапамогі адпусьціў бядняцкім гаспахаркам Беларусі на правядзеньне асеньняе сяўбы 30 тысяч пудоў палепшанага насеньня. Водпуск насеньня праводзіцца праз саўгасы.

Усебеларускія эканамічна-бухгальтарскія курсы

Пры ЦП саюзу саўгандаль-служачых адбылася нарада гаспадарнікаў, на якой пастаноўлена арганізаваць у Менску эканамічна-бухгальтарскія і статыстычныя курсы перападрыхтоўкі. Тэрмін навучаньня—12 месяцаў. На курсы будзе прынята 70 чал. Месцы разьмеркаваны па гаспадарчых органах.

Сацыялістычнае спаборніцтва па ліквідацыі няпісьменнасьці

Прэзыдыум ЦП саюзу працаўнікоў асьветы вынес рад пастаноў аб узмацненьні ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых фабрык і заводаў, саўгасаў, калгасьнікаў і дапрызыўнікоў. Пастаноўлена шырока разьвіць сацыялістычнае спаборніцтва на большы ахоп пунктамі няпісьменных і лепшую пастаноўку работы. У работу па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці павінны быць уцягнуты студэнты ВНУ, тэхнікумаў, слухачы пэдагагічных курсаў, прафшкол, вучні старэйшых кляс сямі годак і г. д.

„Бабушка Данбасу—у Менску

Прадстаўнік МОПР'у Украіны тав. Х. КАЗІНІЦКАЯ на працягу 4-х дзён будзе выступаць з дакладамі аб белым тэроры і задачах МОПР'у на радзе рабочых сходаў. Сёньня тав. КАЗІНІЦКАЯ выступае з дакладам у клюбе саматужнікаў, заўтра на сходзе рабочых заводу «Камунар» і на Рабфаку.

Канфэрэнцыя па барацьбе з брушным тыфусам

9-га верасьня ў чырвоным кутку 1-й савецкай бальніцы адбудзецца гарадзкая канфэрэнцыя ЖАКТ'аў па пытаньні аб барацьбе з брушным тыфусам. На гэтай канфэрэнцыі Белжыласаюз разам з акруговай інспэкцыяй аховы здароўя выпрацуе рад канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньні санітарнага становішча домаўладаньняў ЖАКТ'аў.

Сінагогу—пад арцель інвалідзкай каапэрацыі

Памяшканьне былой сынагогі па Нова-Маскоўскай вуліцы перадана інвалідзкай каапэрацыі для арганізацыі новай трыкатажнай арцелі. На першы час у арцелі будзе працаваць 20 інвалідаў. Заказано ўжо пряжа і машыны. Арцель будзе выпрацоўваць спачатку дамскае трыко, а потым і іншыя трыкатажныя вырабы.

Беларускія пубкі

Дзяржвыдавецтва заказала 10 мастаком Беларусі народныя карціны (лубкі), якія адлюстравалі-б моманты калектывізацыі і індустрыялізацыі БССР. У бліжэйшыя дні адбудзецца грамадзкі агляд работ мастакоў. Лубкі будуць шырока распаўсюджаны ў вёсках Беларусі.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУІ



Вытворчая нарада энтузіястых калфонду Мар,іна

Акадэмік Малюшыцкі пакінуў Беларускай Акадэміі Навук багатую навуковую спадчыну

Беларуская Акадэмія Навук атрымала багатую навуковую спадчыну. Акадэмік М. К. Малюшыцкі, правадзейны член Беларускай Акадэміі Навук, яні нядаўна памёр, у сваім тэстамэнце падарыў Беларускай Акадэміі Навук вельмі каштоўную бібліятэку, якая складаецца з 3-х тысяч тамоў кніг па прыродазнаўчых навуках. Разам з гэтым нябожчык акадэмік падарыў усе свае архівы і рукапісы, якія маюць паступіць часткова ў Беларускую Акадэмію Навук, а часткова ў Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна. Але найбольш каштоўным дарам нябожчыка зьяўляюцца гібрыды (новыя гатункі) бульбы, выведзеныя ім з вельмі ўдалых скрыжаваньняў. Гэтыя новыя гатункі бульбы, паступаць у Навукова-Дасьледчы Інстытут імя Леніна для далейшага вывучэньня і выпуску ў сьвет. Даныя гібрыды зьяўляюцца вынікам шматгадовай навукова-дасьледчай працы акадэміка Малюшыцкага і завяршэньнем яго навуковай дзейнасьці.

СУД

Прыбытковыя заняткі наглядальніка Карцмэра

Падзеі разгортваліся адразу ў двух напрамках. У паштовай ашчаднай касе на Серабранцы зьвярнулі ўвагу на хлопчыка Абрама Каца, які кожны дзень прыносіў картку з маркамі для ўкладу, прычым маркі гэтыя былі падазроныя. Яны ледзь трымаліся, былі зьмятыя і нават мелі сьляды канвэртаў. Падазронасьць прымусіла Каца пераварадраваць у вячэрнюю ашчадную касу цэнтральнай пошты.

Адначасова адміністрацыя Менскага папраўчага дому атрымала шмат скаргаў і заяў зьняволеных, што лісты, якія імі адпраўляюцца дамоў, не даходзяць па прызначэньні. Абедзьве гэтыя акалічнасьці далі магчымасьць разблытаць клубок.

На лаўцы падсудных былы наглядальнік папраўчага дому Карцмэр. Праз яго праходзілі лісты зьняволеных, ён правяраў іх зьмест. Ён хутка «рацыяналізаваў» адпраўку карэспандэнцый, лісты кідаў у печку, а маркі праз Каца клаў на ашчадную кніжку і праз дзень-два атрымліваў адтуль грашыма. Колькасьць зьнішчаных лістоў устанавіць не ўдалося, але іх вельмі многа. Разам з гэтым Карцмэр канфіскаваў грошы, укладзеныя ў лісты, што атрымліваліся і пасылаліся зьняволенымі, але здаваў іх ня ў прыбытак казны, а браў сабе.

Невялікія звароты здавальнялі Карцмэра, але пільнасьць крымвышуку разбурыла наладжаную «справу».

Нарсуд 3-га вучастку пад старшынствам т. Мінкіна прытаварыў Карцмэра да 8-мі месяцаў прымусовых работ з забаронаю на працягу 3-х год займаць пасады ў дзяржаўных і грамадзкіх установах.

А.

Хатнія гаспадыні падпісваюцца на трэцюю пазыку індустрыялізацыі

Па ЖАКТ'ах сярод хатніх гаспадынь вядзецца кампанія за падпіску на трэцюю пазыку індустрыялізацыі. Падпіска праходзіць з вялікім уздымам і дала ўжо 6 тысяч рублёў. У мінулым годзе падпіска на 2-ую пазыку індустрыялізацыі дала толькі 800 руб. У першых радох па падпісцы знаходзяцца ЖАКТ'ы № 1, № 12, 21. На апошнім месцы—ЖАКТ № 10.

Навіны кіно

Фільм „Яўрэі на зямлі"

Маскоўскае таварыства «Восток-кіно» рыхтуе фільм „Яўрэі на зямлі». Фільм адаб'е працэс зямляўпарадкаваньня яўрэяў, жыцьцё і быт яўрэйскіх зямляробаў. Для збору матар'ялаў да фільму ў Менск прыехалі рэжысэр тав. Терын і асыстэнт тав. Карон, якія нав» даюць рад раёнаў Аршанскай, Менскай і Магілеўскай акруг.

Адкрываецца мастацкая студыя

Асацыяцыя Мастакоў Беларусі пастанавіла арганізаваць у Менску мастацкую студыю. У студыю будуць прымацца —рабочая моладзь, а таксама ўзрослыя рабочыя, якія маюць нахіл да вызўленчага мастацтва. Для выкладаньня ў студыі прыцягваюцца кваліфікаваныя мастакі. Студыя адкрыецца ў верасьні кастрычніку.

Прафработу—у цэхі

Саюз швэйнікаў намеціў рад мер па ўзмацненьні прафработы ў цэхах. На фабрыцы «Кастрычнік» у Менску арганізуецца ўпяршыню 4 цэхпраффбюро.

Здарэньні

ПОМСТА. У ноч на 29-е жніўня ў вёсцы Падлужжа, Трухановскага Грэснага раёну здарыўся пажар. Згарэлі 13 хат, 25 гумен і шмат іншых надворных пабудоў, а таксама хатняя жывёла. Страты дасягаюць 25.000 рублёў. Вінаватымі падпалі браты Русаковічы Язэп і Кастусь, сын Язэпа Алесь, і Ціхановіч Аляксей. Падпальшчыкі арыштаваны.

Падпал адбыўся ў сьвята «врачыстай», калі быў п'яны кірмаш.

ХУЛІГАНАЎ ДА АДКАЗНАСЬЦІ: Крымвышук затрымаў гр-н Лупава Сяргея і Ярошэнку Анатолія, якія хуліганілі ў клюбе саўгасу Лошыца-Любаньскае. Справа перадана ў народ. суд.

Паведамленьні Ад НК РСІ

У сувязі з надыходзячай нарадай груп спэцыялістых НКРСІ Беларусі просіць т. т. спэцыялістых, што пісьмова ці праз друк выказалі сваё жаданьне ўдзельнічаць у работах РОУ, зарэгістравацца да 10-га верасьня.

Рэгістрацыя адбываецца штодзённа ад 2 да 3 в палов. гадз. дня ў НКРСІ (Савецкая, 55, 3-ці паверх, 11 пакой).

— ДОМ АСЬВЕТЫ—Сёньня 8IX-роўна а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход жанчын—настаўніц, тэхпрацаўніц і утрыманак сяброў саюзу Працасьветы.

Парадак дня:

Справаздача дэлегатак аб сваёй працы.

2. Справаздача аб дзейнасьці пляцоўкі і аб арганізацыі дзіцячага саду.

3. Аб удзеле настаўніц у працы Жанаддзела.

САД НАРХАРЧ. У панядзелак 9 верасьня а 6 гадз. увеч. ў садзе нархарч адбудзецца сход беспопоўных членаў саюзу нархарч яўка абавязкова.

— РЭСПУБЛІКАНСКАЕ БЮРО АРУ заўтра 9-га верасьня а 6 з пал. гадз. увеч ў памяшканьні бюро (Савецкая 65) адбудзецца чарговае пасяджэньне прэзыдыўму рэспубл бюро АРУ з наступным парадкам дня: 1) Даклад мясцовых груп: МЦРК, Белдзяржгандль і Белсельсаюз аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва, 2) даклад камісіі па павышэньні кваліфікацыі, 3) даклад аб ходзе абсьледаваньня ўстаноў г. Менску, утворанага АРУ па даручэньні сэкцыі РСІ Менскага Гарсавесу, 4) Зацьвярджэньне складу арганізацыйна—інструктарскага аддзелу АРУ, 5) бягучы справы.

Запрашаецца актыў АРУ.

— Каотрычнікаў райком КП(б)Б паведамляе, што ў панядзелак, 9-га верасьня, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні кл. Леніна (былая Чырвоная зала) будзецца прапрацоўка пытаньняў XVI-й партыйнай канфэрэнцыі па групах.

Прапануецца ўсім т.т., вылучаным у гэтыя групы, зьявіцца своечасова.

— Менская АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне прызыдыуму па разгляданьне апэляцыйных спраў аб выключэньні з партыі і інш. партспагнаньнях, накладзеных камісіяй па праверцы Заолаўскай партарганізацыі наступных таварышоў: 1) Ягодзіка, Паўла Іванавіча, 2) Дашчынскага Кастуся Антоцевіча, 3) Шуляка Івана Вікітарава, 4) Дзямідзенкі Міколу Гардзеева, 5) Раўнейка Пятруся Сідарава, 6) Чарнаўсіка Кастуся Яўгена, 7) Гарошка Язэпа Казімерава, 8) Кароткіна Валянціна Дзяменцьцева.

Праезд за свой кошт.

Пасяджэньне абудзецца 12-IX г.г., а 10-й гадзіне раніцы ў памяшканьні АКК (Менск, вул. Энгельса, 28).

Старшыня МАКК ДАМБРОЎСКІ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Ад Валютнага Кіраўніцтва НКФ БССР

20-га верасьня 1929 году ў ТЫФЛІСЕ

АДБУДЗЕЦЦА

4-ы ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ

2-ой ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

У ГЭТЫМ ТЫРАЖЫ РАЗЫГРЫВАЮЦЦА;

18 выйгрышаў па 5.000 руб.
360 „ „ 1.000 „
2.700 „ „ 250 „
105.522 „ „ 100 „

Усяго 108.600 выйгрышаў на суму 11.677.200 руб.

Продаж аблігацый вядзецца ва ўсіх установах Дзяржбанку, ашчадкасах і іншых крэдытных установах.

ПАМЯШКАНЬНЕ ЦЫРКУ — ГАСТРОЛІ Маскоўскага тэатру „Сіняя Блуза"

АДЗІНЫ АДКРЫТЫ АГУЛЬНАДАСТУПНЫ СПЭКТАКЛЬ

Аўторак, 10 верасьня — Білеты ў касе цырку. Падрабнасьці ў афішах.

Серада, 11 верасьня — ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ САЮЗАЎ ХЭМІКАЎ, НАРХАРЧ І КАМУНАЛЬНІКАЎ.

Чацьвер, 12 верасьня — ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗАЎ МЕДСАНПРАЦЫ І ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ.

Пятніца, 13 верасьня — ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ САЮЗУ ХАРЧАВІКОЎ.

Субота, 14 верасьня — ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ САЮЗУ БУДАЎНІКОЎ.

Нядзеля, 15 верасьня — ЗАКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЧЛЕНАЎ САЮЗУ МЭТАЛІСТЫХ.

Білеты на закрытыя спэктаклі па азначаных саюзах.

Памяшканьне цырку спэцыяльна абсталявана.

АДМІНІСТРАЦЫЯ.

САЧЭЦЕ! З 9-га ВЕРАСЬНЯ

МАТЧ БОКСУ

НА ПЯРШЫНСТВА ЭЎРОПЫ. ПРЫЗ 100.000 РУБЛЁЎ

ХЭТЧЫНСОН (белы) супроць БІЛЬЛІ БОБА (чорны)

У бліскучай камэдыі вытворчасьці „УФА"

Нявеста Боксэра

Рэжысэр ЁГАН ГУТЭР

У галоўнай ролі КСЕНІЯ ДЭСЬНІ, ВІЛЬЛІ ФРЫТЧ.

ПРЕМ'ЕРА 30 верасьня

У кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

ВЫ еще не употребляете КРЕМ Вэтэка

Пакой з 5 саж. на Пахгорным зав. № 6, к. 2 (цэнтр гораду) МЯНЯЮ на кватэру з 2-3 пакояў 6-9 саж. у любой часьці гораду бліжэй к цэнтру. Звяніць па тэлефону 8—21 БАБРОЎСКАМУ.

Тэрмінова ПРАДАЕЦЦА КАМЕННЫ ДОМ (36×18 арш.) па Канюшанскай вул. № 3. Там-жа прадаюцца хатнія рэчы і кнігі. Зварочвацца да завдома Татура К. Ф. кв. 1.

НЯ ПЕЦЕ СЫРОЕ ВАДЫ

ПАТРАБУЙЦЕ КВАС

1-га дзяржаўнага заводу „БЕЛАРУСЬ"

На перагатаванай вадзе і чыстым цукры

ПРОДАЖ УСЮДЫ

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА. Нядзеля, 8 верасьня „Багдадский вор" у 3-х дзеях Бэкстабскава. Гэтымі днямі „ХОЛОПКА" Пачатак а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР „Культура" — Амэрыканскі мастац баявік ЧЫКАГА. Пачата к роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Вечары старадаўняе фільмы 10 сусьветных комікаў у 10 гадзіных у адзін сэанс. Слупышкін, Каратышкін, Прэнс, Макс Ліндэр, Чарлі Чаплін, Гарольд Лёйд, Колен Лендыс, Мэры Астор, Быкаў, Папоў. Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз. Каса ад 7 г.

КІНО Інтэрнацыянал — Сёньня мастацкі фільм Цана чалавека. драма з сучаснага жыцьця ў 6 частк. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. 15 хв. Каса адкрыта ад 5 з пал. гадз. увеч.

КІНО Пралетары — Папулярныя Пат і Паташон у новым замежным фільме СІЛА і ХАРАСТВО арыгінальная камэдыя ў 7-мі частках. Штодзенна 4 сэансы: пачатак а 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м., 11 г. Каса—ад 5 г. 30 м.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Юны Піянэр — Новы цікавы фільм савецкай вытворчасьці ПРЫГОДЫ ПАУРУБЛЯ ў 6 частках. Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г. Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.

КІНО СПАРТАК — ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА 1. Апошняя навінка Бэрліну Дзяўчына з правінцыі мэлёдрама ў 7 частках. У галоўн. ролі Ксенія Дэсьні. 2. Выдатны фільм Гоншчык супроць волі камэдыя ў 6 частках. З удзелам Монці Бэнкс. Каса—ад 6 гадз. Пачатак а 7 гадз.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" Ад ПАНЯДЗЕЛКА, 9 верасьня гістарычны мастацкі баявік у 2-х сэрыях 14 частках ДЖАНКІ 1-я сэрыя ў 7 частках. (з эпохі Мікалая І-га) па аповесьці Эшата Неашвілі.

Рэжысэр А. Цуцунава. Апэратар А. Дыгмэлаў.

ДЗЕЙНІЧЫЯ АСОБЫ:

Генэрал Брусілаў — А. Мясьняёў.
Князь Бунчулідзеў — Н. Эліазішвілі.
Князь Тэлесман — Тэл-Гурнэлі.
Яго жонка Тынатынь нар. арт. рэспублікі Е. Чэркізішвілі.
Біскуп — Педкварашвілі.

Пачатак роўна а 7 гадзіне. Каса—ад 5 гадз.

УВАГА! Кіно-тэатр «Культура» ад панядзелка, 9 верасьня пераходзіць на бесперапынны рабочы тыдзень

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" Ад ПАНЯДЗЕЛКА, 9 верасьня па прычыне вялікага посьпеху 2-рі тыдз. Пат і Паташон 2-рі тыдз. у замежным фільме СІЛА І ХАРАСТВО Арыгінальная камэдыя ў 6 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 з пап. гадз., 2 сэансу—9 г., 3-га сэансу—10 г. 30 хв. Каса ад 6 гадз.

Увага! Кіно «Пралетары».—ад панядзелка, 9 верасьня пераходзіць на бесперапынны рабочы тыдзень.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр «Юны піянэр» (будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ») Ад ПАНЯДЗЕЛКА, 9-га верасьня НОВЫ ФІЛЬМ БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ

Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 гадз. 30 хвіл., 2-га—а 5 гадз.

Па нядзелях каса адчынена ад 12 гадз. дня. Цана білета 10 кап.

МЕСЦЫ НУМАРАВАНЫЯ

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

ЛАБОРАТОРИЯ КООПЕРАТИВА ГАЛЕН МОСКВА

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяці капеечныя марки.

Грошы пераводзяцца на адрасе: Менск, Усекабани, бяг. рахунак № 683. Усю карэспанденцыю накіроўваць: Менск, Усекабани, Заочным курсам.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты

пічыць несапраўднымі

Цл. кніжка саюзу саўгандаль-служачых № 3842 Коўшыкава В. Г. 2401

Хабная кніжка ТПО «Пролетарское Единение» на імя Яцкевіч А. І. 2402

Біржавы талён № 1346 Рапульцовіч Э., выд. Менскай біржай працы 2403

Цл. кніжка саюзу Швэйнікаў № 142803 Бабровай С. М. 2404

Пасьведчанье аб сканчэньні 18-й сямігодкі Турацкай С. А. 2405

Пашпарт Чайкоўскага А. Ф., выд. б. Менскай Машчанай Управай 2406

Цл. кніжка № 725 Баброўскага А. Г., выд. саюзам Дрэваапрацоўшыкаў 2407

Чырвонаарм. кніжка Міхайлоўскага М. Ш., выд. Менскім ваенкаматам 2408

Пасьведчаньне Кулікова Е. Н., выд., 1 сав. бальніцай 2409

Вуч.-конская кніжка № 91 Стройна К., выд. Чавускім РВК. 867

Вуч.—конская картка № 8551 Анісімава І., выд. Чавускім РВК. 868

Дапрызыўная кніжка Краўчанка Г. Л., выд. Нараўланскім РВК. 869

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск

Менск. Галоўлітбел № 6[illegible]